WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 ЛІПЕНЯ 2010 г.
СЕРАДА
№ 135
(26743)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

КАЛІ ЯЗВА АБВАСТРЫЛАСЯ І «ДАСТАЎ» ПАНКРЭАТЫТ...

Наўрад ці можна знайсці чалавека, які ніколі не адчуваў болю ў жываце. Ён можа сустракацца пры розных станах — ад самых нявінных расстройстваў да сур'ёзных захворванняў, якія могуць пагражаюць жыццю. На нашай чарговай «прамой лініі» мы пагаворым пра хваробы страўнікава-кішачнага тракту, такія як язвы, гастрыты, панкрэатыты і іншыя.

Вы зможаце задаць пытанні **дацэнту 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу Мікалаю Валянцінавічу КАПРАЛАВУ,** а таксама **дацэнту гэтай жа кафедры, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу Ірыне Аляксандраўне ШАЛАМІЦКАЙ.**

«Прамая лінія» адбудзецца 22 ліпеня, у чацвер, з 14.00 да 15.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 287 18 36 і 287 18 29.

ПА ВЫНІКАХ ПЕРШАГА ЭТАПА ПРАВЕРКІ РАБОТЫ ОРГАНАЎ УЛАДЫ ПРЭЗІДЭНТУ БЕЛАРУСІ ЎНЕСЕНЫ КАДРАВЫЯ ПРАПАНОВЫ

Па выніках першага этапа маштабнага маніторынгу работы органаў улады на разгляд Прэзідэнту Беларусі ўнесены канкрэтныя кадравыя і арганізацыйныя прапановы. Аб гэтым паведаміў журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей, які ўчора правёў гарачую тэлефонную лінію ў адміністрацыі Савецкага раёна Мінска, перадае БЕЛТА.

«Мы дасканала прааналізавалі вынікі першага этапа праверкі са зваротамі і заявамі грамадзян. Матэрыял вельмі шырокі і пазнавальны, і ўся наша далейшая работа будзе будавацца на аналізе папярэдніх этапаў маніторынгу», — сказаў Уладзімір Макей.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што на другім этапе «свядома пашыраны маштабы праверкі са зваротамі грамадзян як у геаграфічным плане, так і ў плане павышэння яе ўзроўню».

«Мы выходзім з наступнага: у краіне створана і даволі эфектыўна функцыяную сістэма работы са зваротамі грамадзян. Але, на жаль, атрымліваецца так, што многія кіраўнікі, з-за тых ці іншых прычын, прывыклі, што для іх на першым плане знаходзяцца вытворчыя праблемы. А праблемы канкрэтнага чалавека адыходзяць на другі, а то і на трэці план. З майго пункту гледжання, гэта ў большай меры суб'ектыўная прычына. Казаць пра тое, што ў краіне адсутнічае сістэма работы са зваротамі грамадзян, было б абсалютна неправамерна, — сказаў Уладзімір Макей. — Сістэма створана, яна функцыяную дастаткова эфектыўна. Але з прычыны, можа, абыякавасці, коснасці асобных чыноўнікаў на месцах гэта работа з чалавекам адыходзіць на другі план».

«Менавіта таму Прэзідэнт прыняў адпаведнае рашэнне аб тым, каб прымусіць чыноўнікаў павярнуцца тварам да людзей, прычым не на словах, а на справе», — сказаў Уладзімір Макей.

Паводле яго слоў, кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб выніках першага этапа праверкі. «Мы ўнеслі на разгляд Прэзідэнта канкрэтныя прапановы, у тым ліку кадравыя і арганізацыйныя. Калі ён іх падтрымае, то шэраг чыноўнікаў паплацяцца сваімі пасадамі», — дадаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ён таксама адзначыў, што даныя праверкі — «гэта не нейкі кавалерыйскі наскок, а сістэмная работа». «Яна не скончыцца ні другім, ні трэцім этапам, будзе праводзіцца сістэмна, і, калі спатрэбіцца, Адміністрацыя Прэзідэнта будзе на самым высокім узроўні праводзіць такія мерапрыемствы. Да таго часу, пакуль мы не навядзём парадак у гэтай сферы і не прымусім канкрэтнага чыноўніка, кіраўніка на месцах павярнуцца тварам да чалавека», — адзначыў Уладзімір Макей.

У час правядзення гарачай тэлефоннай лініі Уладзіміру Макею былі зададзены пытанні, якія датычацца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўнічай сферы і многага іншага.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАРАЛЕПЕЛЬСКІ ЭКАДОМ

У вёсцы Стары Лепель Лепельскага раёна будуецца 22-і дом па экалагічна чыстай тэхналогіі. Яго ўзводзяць работнікі будаўнічай фірмы «Экадомбуд».

НА ЗДЫМКУ (злева направа): Уладзімір ВЫШЧЫВАНЮК, Юрый ХАРАНЕНКА, Аляксандр БЕЛЬЧАНКА.

Ва Урадзе

УВАХОДЖАННЕ Ў ТРЫЦЦАТКУ — НЕ ФАРМАЛЬНАЯ ГОНКА ЗА БАЛАМІ Ў РЭЙТЫНГУ...

Ігар ШЧУЧЭНКА

НА ПРАЦЯГУ апошніх гадоў Беларусь вядзе актыўную працу па ўдасканаленні прадпрымальніцкага і інвестыцыйнага клімату з мэтай паляпшэння рэйтынгу ў справаздачы Сусветнага банка па ўмовах вядзення бізнэсу. Пра гэта ішла ўчора гаворка на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, і на якім разглядаліся захады па ўваходжанні рэспублікі ў трыццатку краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для вядзення бізнэсу. Захады, што робяцца ў краіне, ужо далі плён: на сёння Беларусь займае 58-ю пазіцыю ў рэйтынгу Сусветнага банка ў параўнанні са 115-м месцам у 2007 годзе. А па выніках справаздачы «Вядзенне бізнэсу-2010» наша краіна ў чарговы раз увайшла ў пяцёрку лідараў па колькасці праведзеных рэформаў у сферы рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці і эфекту ад іх.

Як нагадаў **віцэ-прэм'ер Андрэй КАБЯКОЎ,** асноўныя паказчыкі, якія фарміруюць рэйтынг, — рэгістрацыя, атрыманне дазволу на будаўніцтва, наём працоўнай сілы, рэгістрацыя ўласнасці, крэдытаванне, абарона інвестараў, падаткаабкладанне, міжнародны гандаль і забеспячэнне выканання кантрактаў. Найбольш істотныя вынікі па паляпшэнні рэйтынгу былі дасягнутыя Беларуссю па 5 з 10 паказчыкаў справаздачы Сусветнага банка: гэта рэгістрацыя прадпрыемства — 7-е месца, рэгістрацыя ўласнасці — 10-е, забеспячэнне выканання кантрактаў — 12-е, наём працоўнай сілы — 32-е і атрыманне дазволу на будаўніцтва — 44-е месца. Аднак, падкрэсліў намеснік прэм'ера, ёсць у краіне і слабыя месцы, напрамкі, па якіх яшчэ шмат неабходна будзе зрабіць. У першую чаргу, гэта падаткаабкладанне, дзе Беларусь займае апошняе 183-е месца, а таксама міжнародны гандаль — 129-е, крэдытаванне — 113-е, абарона інвестараў — 109-е і ліквідацыя — 74-е месца.

СТАР.2

белагропромбанк
традиции будущего

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		275 853,2	240 164,9
3	Средства в Национальном банке	1102		973 838,1	188 926,6
4	Ценные бумаги:	1103		753 717,9	908 753,0
	для торговли	11031		-	-
	удерживаемые до погашения	11032		5,8	5,3
	в наличии для продажи	11033		753 712,1	908 747,7
5	Кредиты и другие средства в банках	1105		378 492,7	133 404,1
6	Кредиты клиентам	1106		19 174 547,4	15 514 966,6
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107		153 045,1	35 595,3
8	Основные средства и нематериальные активы	1108		498 609,8	428 582,7
9	Прочие активы	1109		157 068,7	127 316,5
10	**ИТОГО активы**	**110**		**22 365 172,9**	**17 577 709,7**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202		3 475 493,4	2 099 791,3
13	Кредиты и другие средства банков	1205		3 701 915,3	2 780 337,9
14	Средства клиентов	1206		8 975 321,1	7 898 018,5
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		1 437 599,7	196 887,1
16	Прочие обязательства	1209		95 338,9	151 512,6
17	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**17 685 668,4**	**13 126 547,4**
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211		3 878 635,0	3 828 633,5
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		193 989,9	85 500,1
22	Накопленная прибыль	1214		365 625,8	310 524,9
23	Фонд переоценки статей баланса	1215		241 253,8	226 503,8
24	**ВСЕГО капитал**	**121**		**4 679 504,5**	**4 451 162,3**
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**22 365 172,9**	**17 577 709,7**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301		22 932 162,7	15 029 131,7
28	Обязательства	1302		1 889 756,5	2 691 562,5

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 351 089,3	961 507,0
2	Процентные расходы	2012		765 646,9	684 095,9
3	Чистые процентные доходы	201		585 442,4	277 411,1
4	Комиссионные доходы	2021		124 591,3	107 825,3
5	Комиссионные расходы	2022		16 819,8	13 544,5
6	Чистые комиссионные доходы	202		107 771,5	94 280,8
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203		60 751,6	(-122 173,5)
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(-7 068,5)	(-432,9)
9	Доход в форме дивидендов	205		178,2	145,2
10	Чистые отчисления в резервы	206		398 659,2	81 626,3
11	Прочие доходы	207		111 552,8	186 637,9
12	Операционные расходы	208		207 769,0	184 767,9
13	Прочие расходы	209		55 129,4	27 778,1
14	Налог на прибыль	210		58 764,0	45 967,8
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		138 306,4	95 728,5

Председатель Правления **С.Н. Румас**
И.о. главного бухгалтера **И.А. Медвецкий**
Дата подписания «12» июля 2010 г.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, MTC) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.

Рынак жылля

СЯРЭДЗІНА ЛЕТА — ШАНЦ НАБЫЦЬ ТАННУЮ КВАТЭРУ

Сяргей КУРКАЧ

Ужо традыцыйна, пачынаючы з другой дэкады ліпеня, на другасным рынку жыллёвай нерухомасці сталіцы назіраецца самая моцная хваля патаннення кватэр. У гэты час рынак крыху ажывае, бо самыя кемлівыя патэнцыйныя пакупнікі шукаюць сабе максімальна патаннелыя кватэры менавіта цяпер.

У продажы з'явіліся аднапакаёвыя «хрушчоўкі» за 35—37 тысяч USD

Згодна са статыстыкай інфармацыйнага каталога сталічнага партала жыллёвай нерухомасці, сярэдні кошт квадратнага метра агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр складае сёння 1414 долараў. Атрымліваецца, што менш чым за месяц жыллёвы «квадрат» маленькіх кватэр патанneў ужо на 30 долараў. **Начальнік аддзела продажу сталічнага агенцтва нерухомасці «БелЦТН» Ірына ТОЛСЦІКАВА** адзначае, што ў іх каталогах сёння існуе дастаткова прапаноў стандартных аднапакаёвых кватэр нават у дзевяціпавярховых дамах па кошце каля 38—39 тысяч долараў. Невялікія аднапакаёвыя «хрушчоўкі» сярэдняй якасці магчыма набыць сёння за 35—37 тысяч долараў.

Такіх мінімальных цэнаў на аднапакаёўкі не было нават у ліпені мінулага года. Самыя танныя аднапакаёвыя «хрушчоўкі» сёння прапануюцца ў сталіцы па вуліцах Карпава, Чыгладзэ, Казінца, Багдановіча, Крупскай, Уральскай, у Заводскім раёне і Шабанах.

Істотна патаннелі ў ліпені і слабенькія двухпакаёвыя «хрушчоўкі», якія сталі прапаноўвацца нават за 44—47 тысяч долараў. Крыху лепшыя двухпакаёвыя кватэры ў 9-павярховых дамах каштуюць сёння прыкладна 49—50 тысяч долараў. Трохпакаёвыя «хрушчоўкі» выстаўляюцца па мінімальным кошце ў межах 58—60 тысяч долараў. Аднак такія кватэры на крайніх паверхах старых пяціпавярховых дамоў па вуліцах Альшэўскага, Убарэвіча, Тухачэўскага, Казінца, Народная, Клумава і Каліноўскага прадаюцца цяпер па кошце да 56—57 тысяч долараў.

Вядома, што на рынку існуюць і больш дарагія кватэры, аднак пакупнікі цяпер шукаюць і набываюць менавіта таннае жыллё, калі квадратны метр агульнай плошчы прапануецца не даражэй чым за 1200—1300 долараў. Цяпер пакупнікі «пільнуюць» так званыя хуткія кватэры, калі гаспадарам трэба тэрмінова прадаць сваю нерухомасць. Звычайна на другасным рынку зніжкі па недарагім жыллі складаюць да 1—2 тысяч долараў, а вось пры тэрміновым продажы ўладальнікі кватэр могуць скінуць і да 4—5 тысяч долараў.

Мінімальныя цэны пратрымаюцца да верасня?

Цяпер на другасным рынку жыллёвай нерухомасці сталіцы існуе самая вялікая колькасць прапаноў. Толькі ў сярэдняга па аб'ёмах агенцтва нерухомасці «БелЦТН» у каталогах знаходзіцца больш за тысячу розных відаў кватэр на продаж сярэдняга цэнаснага рангу. Так, цяпер самыя танныя кватэры, што прапануюцца праз тэрміновы продаж, набываюцца пакупнікамі амаль імгненна. Аднак ужо праз некалькі дзён на рынку з'яўляюцца чарговыя танныя кватэры. Летам на рынку застаецца мінімальная колькасць рэальных пакупнікоў, таму яны робяцца вельмі перабарлівымі і патрабуюць у прадаўцоў дадатковых зніжак.

Спадарыня Толсцікава адзначае, што для больш актыўнага набыцця жылля на другасным рынку ў жыхароў Мінска проста не хапае наяўных грошай. Прыкладна палова ўсіх здзелак ажыццяўляецца сёння з выкарыстаннем крэдытных сродкаў. Да апошняга часу крэдыты былі вельмі дарагімі і карысталіся імі толькі ў выключных выпадках. Сёння сітуацыя з крэдытамі крыху палепшылася. Цяпер агенцтва «БелЦТН» можа прапанаваць сваім кліентам паслугі каля 5 банкаў, якія выдаюць крэдыты пад канкрэтныя здзелкі з нерухомасцю пад 17 працэнтаў гадавых на агульных падставах.

Улічваючы гэтыя фактары, спецыялісты другаснага рынку нерухомасці прагназуюць, што ў ліпені невялікае патанненне ўсіх тыпаў немаладых кватэр будзе працягвацца, а ў жніўні мінімальныя цэны на недарагія кватэры трапяць у рэжым стабілізацыі. Эксперты ўпэўненыя, што толькі ў верасні магчыма нейкае змяненне цэнасных тэндэнцый, і толькі ў тым выпадку, калі працэнты па жыллёвых крэдытах паменшацца да 13—14 працэнтаў гадавых.

Танная «далёўка» — толькі за кальцавой

Калі летам былыя ў карыстанні кватэры працягваюць таннець, то ў сектары будаўніцтва новага жылля склалася зусім іншая тэндэнцыя. Па лініі долевага будаўніцтва кватэры працягваюць даражэць. У сталіцы сярэдні кошт квадратнага метра для дольнікаў складае 1300 долараў. Зразумела, што гаворка ідзе пра жыллё для нечаргавікоў, якое будуецца без аздаблення. Часам на рынку існуе і таннейшае будаўніцтва, аднак да яго трэба ставіцца вельмі крытычна, бо можна патрапіць у спіс падманутых.

Рэальна таннейшае жыллё будуецца сёння па лініі долевага будаўніцтва за кальцавой дарагой — у Калодзішчах і Бараўлянах. Там квадратны метр агульнай плошчы будаўніцтва жылля без аздаблення каштуе прыкладна 850—900 долараў. Цяпер і на такое ўмоўна сталічнае жыллё сярод жыхароў Мінска існуе ўстойлівы попыт.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ПОЛЬШЧЫ «ЛОБ У ЛОБ» СУТЫКНУЛІСЯ ПАСАЖЫРСКІЯ ЦЯГНІКІ: 25 ПАРАНЕНЫХ

У Польшчы на чыгуначнай станцыі Казыб'е Слупскага павета Паморскага ваяводства, што на поўначы краіны, адбылося сутыкненне двух пасажырскіх цягнікоў. Паводле слоў выратавальнікаў, «у выніку аварыі паранена больш за 20 чалавек, з іх пяцёра знаходзяцца ў цяжкім стане».

Цягнікі сутыкнуліся «лоб у лоб» на пад'ездзе да станцыі з розных кірункаў у 09:10 па мясцовым часе. Сур'ёзна пашкоджаныя першыя некалькі вагонаў абодвух саставаў. Рух на гэтым участку дарогі ўчора быў заблакаваны. Улады мяркуюць, што інцыдэнт адбыўся па віне чыгуначнага абсталявання. Паводле неафіцыйных звестак, прычынай сутыкнення стала памылка дзяжурнага на ўчастку. Ахвяраў атрымалася пазбегнуць, паколькі сутыкненне адбылося ў зоне станцыі, дзе цягнікі рухаюцца са зніжанай хуткасцю.

ЗЮГАНАЎ ПАКРЫТЫКАВАЎ МЯДЗВЕДЗЕВА ЗА «ЎЛАГОДЖВАННЕ АМЕРЫКІ» І ГАЗАВЫ КАНФЛІКТ З БЕЛАРУССЮ

Расія «прагінаецца перад ЗША», здраджваючы сваім нацыянальным інтарэсам, заявіў лідар КПРФ Генадзь Зюганаў і запатрабаваў ад расійскага кіраўніцтва перагледзець знешнюю палітыку краіны. Цяперашняе становішча лідар камуністаў успрымае як «зневажальнае» і «разбуральнае», бо заходнія дзяржавы бачаць у гэтым «гатовасць (Расіі) і далей здаваць свае пазіцыі».

Варта адзначыць, што заяву Зюганава прэс-служба партыі распаўсюдзіла праз дзень пасля сустрэчы прэзідэнта Мядзведзева з расійскімі дыпламатамі, падчас якой ён агучыў новую знешнепалітычную дактрыну РФ. Тады сярод прыярытэтных кірункаў прэзідэнт назваў менавіта ЗША і Еўропу.

Каб даказаць, што ўлада здраджвае інтарэсам свайго народа, Зюганаў прывёў у прыклад рашэнне пра куплю ў ЗША 50 самалётаў Boeing для «Аэрафлота», а таксама адмену забароны на ўвоз амерыканскіх курыных кумпячкоў. Акрамя таго, паводле меркавання Зюганава, падтрымка санкцый супраць Ірана таксама была памылковай, бо цалкам супярэчыць геапалітычным інтарэсам Расіі, як, зрэшты, і «газавая вайна» з Беларуссю.

ФРАНЦУЗСКІ ЎРАД ПАДТРЫМАЎ ПАВЫШЭННЕ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ

Урад Францыі ўхваліў законапраект, у адпаведнасці з якім пенсійны ўзрост у краіне будзе павышаны з 60 да 62 гадоў. Пра гэта паведамляе BBC News.

Законапраект будзе накіраваны на разгляд парламента. Чакаецца, што галасаванне па гэтым дакументе адбудзецца ў сёлетнім верасні. Прэзідэнт Францыі Мікаэль Сарказі разлічвае, што канчаткова закон пра пенсійны ўзрост будзе прыняты да кастрычніка. За кошт павышэння ўзросту выхаду на пенсію ўлады Францыі маюць намер скараціць дэфіцыт бюджэту краіны. Сёлета дэфіцыт бюджэту, як чакаецца, складзе 32 мільярды еўра, а да 2020 года можа вырасці да 45 мільярдаў.

Тым часам самі французы не падтрымліваюць рашэння ўладаў павялічыць пенсійны ўзрост. Супраць гэтага выступілі чатыры з пяці найбуйнейшых прафсаюзаў краіны. Акрамя таго, у маі-чэрвені жыхары Францыі правялі некалькі страйкаў у знак пратэсту супраць павелічэння пенсійнага ўзросту.

ТАЛІБЫ ЎЗБРОЙВАЮЦЬ МАЛПАЎ АЎТАМАТАМІ, А КАРЭЙЦЫ АДПРАЎЛЯЮЦЬ НА МЯЖУ БАЯВЫХ РОБАТАЎ

Афганскія талібы рыхтуюць малпаў спецпрызначэння для барацьбы з амерыканцамі, сцвярджаюць кітайскія журналісты. Прыматаў нібы ўзброяць аўтаматамі АК-47, кулямётамі «Брэн» і траншэйнымі мінамётамі, каб выкарыстоўваць іх для нападаў на амерыканскіх вайскоўцаў у Афганістане. Як паведамляе People's Daily Online, брытанскім карэспандэнтам удалося сфатаграфаваць малпаў-тэрарыстаў са зброяй наперавес. А на партале YouTube ёсць відэашэраг з анімацыяй і рэальнымі фатаграфіямі.

Кітайскае выданне спасылаецца на паведамленне нейкага брытанскага выдання ад 27 чэрвеня, у якім распавядаецца пра ініцыятыву талібаў і адзначаецца, што ідэя выкарыстоўваць малпаў у вайне распрацоўвалася ЦРУ падчас вайны ў В'етнаме ў 60—70-х гадах XX стагоддзя. Прыматы павінны былі пранікаць у джунглі і там забіваць в'етнамцаў.

У той жа час Паўднёвая Карэя паставіла робатаў на ахову сваёй мяжы з КНДР, піша брытанская газета The Daily Telegraph. Два робаты, абсталяваныя сістэмамі разведкі, апазнання чалавечага голасу, сачэння і вядзенні агню, дзейнічаюць у складзе аб'яднанай баявой адзінкі, удакладніў прадстаўнік міністэрства абароны. Кошт баявой адзінкі — каля 330 тыс. долараў. Яна заступіла на службу яшчэ ў чэрвені на адным з пастоў у цэнтральным сектары Дэмілітарызаванай зоны, якая падзяляе Карэйскі паўвостраў.

У выпадку, калі выпрабаванні будуць паспяховымі, робатаў усталююць уздоўж усёй мяжы. Прыпошуку цэлі баявы робат выкарыстоўвае датчыкі цяпла і руху. Выявіўшы цэль, ён перадае паведамленне ў камандны цэнтр. Калі аператар каманднага цэнтра не ў стане апазнаць аб'екты пры дапамозе аўдыё- і відэасістэм робата, ён можа аддаць загад робату на адкрыццё агню з 40-міліметровага аўтаматычнага гранатамёта.

ДЗЕЦІ ЗНАЙШЛІ ТАПЕЛЬЦА

11 ліпеня ў Пячэрскім возеры ў Магілёве знойдзена цела невядомага мужчыны. Дзеці купаліся ў возеры і перажылі шок, калі наступілі на цела чалавека, якое ляжала на дне на глыбіні каля 2-х метраў. Абставіны гібелі і асоба тапельца, якому прыблізна каля 30 гадоў, цяпер устанаўліваюцца. Ніякіх рэчаў на беразе не знайшлі. Ніхто не падымаў трывогу. Выратавальнікі, праўда, адзначылі пах спіртнога ў тапельца.

Ілона ІВАНОВА.

ПАЛІГРАФІЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ АЎТААКУМУЛЯТАРАЎ

Лёгкім рухам паліграфічнай тэхнікі акумулятарныя батарэі турэцкай вытворчасці сталі куды больш магутнымі. Ідэя прыйшла ў галаву 30-гадоваму бізнэсмену, які ніяк не мог прадаць заляжалы тавар.

Калісьці ён прывёз партыю турэцкіх акумулятараў «Platin Classic», але ж попытам яны не карысталіся, бо ў моцны мароз магутнасці пускавога току не хапала, каб правярнуць стартар. Прадпрымальнік, які ўсё працоўнае жыццё займаецца продажам аксесуараў для аўтамабіляў, вырашыў змяніць сітуацыю кардынальнымі мерамі. Для гэтага ў фірме, якая суседнічала на паверсе з яго фірмай, грамадзянін замовіў выраб стужкі на клейкай аснове з новымі рэквізітамі. Такім чынам партыя тавару набыла ліпавыя «дакументы». З іншымі параметрамі яна пайшла вельмі паспяхова. Гамяльчанін распаўсюдзіў несапраўдную інфармацыю аб таварах і паслугах — учыніў злачынства, прадугледжанае ч.1 артыкула 250 Крымінальнага кодэкса Беларусі, якое выявілася ў змяненні звестак аб характарыстыках акумулятарных батарэй маркі «Platin Classic» і водпуску іх у далейшую рэалізацыю». Колькі было рэалізавана батарэй — цяпер цяжка падлічыць, бо фірма займалася пастаўкамі не толькі па ўсёй Гомельшчыне, але ж і аптовымі — у Пінск, Магілёў і іншыя гарады. На складах канфіскаваныя толькі рэшткі тавару на суму больш чым пяць мільёнаў рублёў. Паколькі бізнэсмен прызнаў сваю віну цалкам, у дачыненні да яго была вынесеная пастанова аб адмове ў завядзенні крымінальнай справы — па амністыі. Але ж вялізны штраф заплаціць давядзецца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.07.2010 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША 3 013,00	1 чэшская крона 149,63	USD 30,8823	Агенцтва Уладзіміра Грыцова
▼ 1 еўра 3 787,64	1 польскі злоты 927,68	10 UAH 39,0668	
1 латвійскі лат 5 348,84	▼ 1 расійскі рубель 97,56	1000 BYR 10,2736	
1 літоўскі літ 1 097,15	1 украінская грыўня 381,15	EUR 38,8716	

УВАХОДЖАННЕ Ў ТРЫЦЦАТКУ — НЕ ФАРМАЛЬНАЯ ГОНКА ЗА БАЛАМІ Ў РЭЙТЫНГУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Летась і сёлета, паведаміў Андрэй Кабякоў, праца па паляпшэнні пазіцый Беларусі ў чарговым рэйтынгу «Вядзенне бізнэсу-2011», які будзе апублікаваны ў верасні гэтага года, праводзілася ў адпаведнасці з распрацаваным рабочай групай зацверджаным планам дзеянняў. З запланаваных 47 мерапрыемстваў ужо выкананыя 23, а на стадыі выканання знаходзіцца яшчэ 21 мерапрыемства. Падчас рэалізацыі плана дзеянняў падрыхтаваныя 27 праектаў нарматыўных прававых актаў, з якіх прынятыя 15. У прыватнасці, віцэ-прэм'ер згадаў падрыхтаваны законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон Беларусі «Аб гаспадарчых таварыствах». Дакумент ухвалены двума палатамі парламента і знаходзіцца на падпісанні ў Прэзідэнта. У праект закона ў адпаведнасці з рэкамендацыямі Сусветнага банка ўключаны нормы, якія прадугледжваюць патрабаванне аб раскрыцці для ўсеагульнага ведама інфармацыі аб здзелках, у здзяйсненні якіх зацікаўленыя члены савета дырэктараў, члены калегіяльнага выканаўчага органа, асобы, якія ажыццяўляюць паўнамоцтвы аднаасобнага выканаўчага органа гаспадарчага таварыства, і іх блізкіх сваякоў, за магчыма кароткі тэрмін. Праект закона прадугледжвае таксама неабходнасць неадкладнага раскрыцця інфармацыі аб любой калізіі інтарэсаў, якія ўзнікаюць у працэсе дзейнасці гаспадарчага таварыства. Па ацэнцы Мінэканомікі, прыняцце гэтага закона дазволіць Беларусі ўвайсці ў другі-трэці дзясятак краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі па абароне інвестараў.

Наогул жа, паводле ацэнкі Мінэканомікі, аналіз прадстаўленай зацікаўленымі дзяржорганамі прамежкавай інфармацыі аб выніках працы па паляпшэнні рэйтынгу Беларусі ў справаздачы Сусветнага банка «Вядзенне бізнэсу -2011» дазволіць палепшыць пазіцыю нашай краіны з улікам рэалізаваных захадаў да 1 чэрвеня 2010 года арыенціровачна на 10 пунктаў. Гэта значыць, чакаецца наяўнасць у нашай краіны 48-га месца. Разам з тым, мяркуе Андрэй Кабякоў, больш дакладна пра месца Беларусі ў рэйтынгу можна будзе весці гутарку пасля аналізу, які правядуць эксперты Сусветнага банка, таму што іншыя краіны таксама не стаяць на месцы, і што будзе таксама ўлічвацца экспертамі. Адзначыў намеснік прэм'ера і той момант, што эксперты Сусветнага банка не ў поўным аб'ёме ўлічваюць рэформы, якія маглі б скласці аснову для ацэнкі прадпрымальніцкага клімату і вызначэння рэйтынгу краіны. У прыватнасці, гаворка ідзе пра такія паказчыкі, як падаткаабкладанне, міжнародны гандаль, ліквідацыя прадпрыемстваў. Ён патлумачыў, што неабходна браць пад увагу асаблівасці методыкі падрыхтоўкі штогадовай справаздачы Сусветнага банка і крыніцы звестак, якія выкарыстоўваюцца і якія прадугледжваюць у тым ліку выбарачныя апытанні рэспандэнтаў па ацэнцы адміністрацыйнай нагрузкі ў розных сферах дзейнасці. У гэтай сувязі Андрэй Кабякоў прапанаваў зацікаўленым органам дзяржкіравання зрабіць дадатковыя захады па інфармацыйным суправаджэнні апытанняў суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія праводзяцца ў рамках даследавання «Вядзенне бізнэсу».

Закранаючы адно з самых балючых пытанняў — падаткаабкладанне, віцэ-прэм'ер заўважыў, што ў Беларусі за пяць гадоў тут праведзена значная работа: адменена 26 падаткаў і плацяжоў, рэалізавана 57 сістэмных захадаў па спрашчэнні падатковай сістэмы. У такім разе, чым абумоўлены нізкі рэйтынг краіны па падаткаабкладанні? На думку Андрэя Кабякова, гэта адбываецца па некалькіх прычынах. У прыватнасці, змены ў падаткаабкладанні, якія праводзяцца ў Беларусі, улічваюцца ў справаздачы Сусветнага банка з лагам у 1 год: «тое, што мы зрабілі летась па спрашчэнні падаткаабкладання, — патлумачыў віцэ-прэм'ер, — і ўвялі з гэтага года, будзе ўлічана ў справаздачы «Вядзенне бізнэсу-2012».

Напрыканцы Андрэй Кабякоў зазначыў, што сістэмная праца па ўдасканаленні ў краіне ўмоў ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці і стварэння спрыяльнага інвестыцыйнага клімату будзе працягвацца. «Рэзерваў у гэтых напрамках застаецца шмат, і сёння патрабуюцца больш выніковыя і пераканаўчыя захады па стымуляванні і ўсебаковай падтрымцы бізнэс-ініцыятывы, павышэнні інвестыцыйнай прывабнасці краіны», — падкрэсліў ён. У увязі з гэтым рабочая група рыхтуе новую рэдакцыю плана захадаў па забеспячэнні ў найбліжэйшыя гады рэйтынгу Беларусі ў справаздачы Сусветнага банка «Вядзенне бізнэсу» не ніжэй за 30-ю пазіцыю. Гэты праект плана ўтрымлівае кароткатэрміновыя захады, у тым ліку і тыя, што не ўдалося выканаць у рамках папярэдняга плана, а таксама сярэднетэрміовыя. Паводле слоў намесніка прэм'ера, хутчэйшае ўваходжанне Беларусі ў лік трыццаці краін з'яўляецца арыенцірам працы па стварэнні спрыяльных умоў для ажыццяўлення інвестыцыйнай і прадпрымальніцкай дзейнасці, а не фармальнай гонкай за дадатковымі баламі ў рэйтынгу. «Незалежна ад дасягнутых поспехаў па тых ці іншых паказчыках у справаздачах Сусветнага банка неабходна пастаяннае правядзенне рэформаў ва ўсіх сферах прадпрымальніцкай дзейнасці, у тым ліку з улікам рэкамендацый Сусветнага банка і станоўчай практыкі іншых замежных краін», — канстатаваў ён.

13-гадовая дзяўчынка патанула ў Круглянскім раёне

За мінулы тыдзень у Магілёўскай вобласці патанулі 13 чалавек.

11 ліпеня ў Круглянскім раёне дзяўчынка адпачывала на возеры разам з кампаніяй дзяцей. Яна пайшла ў ваду і ў 1,5 метра ад берага трапіла на глыбокае месца. Потым запанікавала, хлёбнула вады, паклікала на дапамогу і знікла пад вадой. Мужчына, які аказаўся непадалёк, выцягнуў дзяўчынку, але рэанімаваць яе не ўдалося.

У Чэрыкаўскім раёне 5 ліпеня 29-гадовы мужчына купаўся ўдзень разам з сынам: хлопчык трапіў на глыбокае месца і стаў тануць. Бацька кінуўся ратаваць, падштурхнуў яго да берага, але сам не выбраўся. Выратавальнікі на вадзе заключаюць да асцярожнасці, тым больш што ў спякотныя дні колькасць ахвотнікаў асвяжыцца значна павялічваецца.

Ілона ІВАНОВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА

ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

СООБЩАЕТ:

Лот № 1: Право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 221200000001001029 площадью 0,4937 га, расположенного по адресу: Витебская обл., Витебский район, для строительства и обслуживания объекта «Объект торговли площадью не менее 2500 кв. метров (2 этажа и более) и общественного питания не менее чем на 160 мест в микрорайоне многоэтажной застройки «Билево-2» в г. Витебске», срок аренды 50 лет, опубликованный в информационном сообщении о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в газете «Звязда» от 30 июня 2010 г. № 125 (26733), снимается с торгов согласно решению Витебского районного исполнительного комитета.

Лот № 2: Право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 221200000001001028 площадью 0,9559 га, расположенного по адресу: Витебская обл., Витебский район, для строительства и обслуживания объекта «Объект торговли площадью не менее 1000 кв. метров (2 этажа и более) в микрорайоне многоэтажной застройки «Билево-2» в г. Витебске», срок аренды 50 лет, опубликованный в информационном сообщении о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в газете «Звязда» от 30 июня 2010 г. № 125 (26733), снимается с торгов согласно решению Витебского районного исполнительного комитета.

Сумма задатка, внесенная участниками аукциона на счет городского исполнительного комитета, подлежит возврату им в течение 5 рабочих дней со дня отказа местного исполнительного комитета от проведения аукциона.

Приносим свои извинения. Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, vitinvest.biz.

Абзац

Новы тралейбусны маршрут № 2, які звяжа Зялёны Луг-7 і Уручча-2, арганізуецца ў Мінску з 17 ліпеня. Тралейбус будзе рухацца па вуліцах Мірашнічэнкі, Гамарніка, Карбышава, Сядых, Каліноўскага, Усіхсвяцкай, Гінтаўта, Шафарнянскай, Русіянава ў прамым і зваротным напрамках.

Засталіся без даху адзін жылы дом і 26 сельскагаспадарчых аб'ектаў на тэрыторыі шасці паселішчаў Мінскай, двух паселішчаў Магілёўскай і аднаго паселішча Гомельскай абласцей. У панядзелак пераважна па паўднёвым усходзе краіны прайшлі кароткачасовыя дажджы з навальнічамі.

У кватэры мінчаніна 1986 г. н. было знойдзена 152,89 г грыбоў, якія ўтрымліваюць псіхаактыўныя рэчывы псілацын і псілацыбін. Галюцынагенныя грыбы былі канфіскаваныя, а ў дачыненні да маладога чалавека заведзена крымінальная справа. Яму пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі.

Непрацуючы 20-гадовы жыхар Мінска не толькі прадаваў праз інтэрнэт алкаголь без акцызных марак, але і не быў зарэгістраваны як прадпрымальнік. Падчас аператыўных мерапрыемстваў у яго канфіскавана 24 бутэлькі рому, дзве — тэкілы і адна — джыну. Агульны аб'ём алкаголю склаў 27 л (на суму 1,7 млн бел. руб.). Міліцыя высвятляе, якім чынам гэты алкаголь трапляў у Беларусь. Гандляру пагражае сур'ёзны штраф — да 20 базавых велічыняў (адна велічыня цяпер роўная 35 тыс. бел. руб.)

У Фрунзенскім раёне двое пенсіянераў наладзілі гандаль алкаголем падчас футбольных матчаў недалёка ад стадыёна. Як вядома, падчас правядзення такіх мерапрыемстваў у найбліжэйшых да спартаб'екта крамах спіртное не прадаецца. На гэтым і вырашыла зарабіць пара пенсіянераў, якія пражываюць недалёка ад стадыёна «Дынама-Юні». Рэалізацыю алкаголю яны арганізавалі прама ў сябе на кватэры. Прыемна прадавалі моцныя напоі як прамысловага вырабу (гарэлка, віно), так і ўласнага. У пенсіянераў канфіскавана 19,5 л алкаголю прамысловай вытворчасці і 15 л спірту, разведзенага вадой.

Суд Фрунзенскага раёна Мінска 12 ліпеня абвясціў прыгавор па справе трох супрацоўнікаў ДАІ. Тры інспектары дарожна-патрульнай службы УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама — капітан, старшы лейтэнант і старшы прапаршчык — прымалі грашовыя сродкі ад вадзіцеляў, аўтамабілі якіх былі эвакуяваныя на спецыяльную ахоўную стаянку. Грошы павінны былі паступаць на спецыяльны рахунак у банку. Аднак інспектары прысвойвалі іх. Суд прыгаварыў іх да пазбаўлення волі ад 2,5 да 3 гадоў з адтэрміноўкай выканання пакарання. Прыгавор пакуль не ўвайшоў у законную сілу і можа быць абскарджаны на працягу 10 дзён.

Як паведамілі БЕЛТА ў праваахоўных органах, у Гомелі затрыманы інспектар дарожна-патрульнай службы ДАІ. Ён падазраецца ў тым, што за непрыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці атрымаў 40 л дызельнага паліва.

Поўны абзац

Студэнтка са Шры-Ланкі, якая жыве ў Вялікабрытаніі, мае намер падаць у суд на турфірму, якая адмяніла яе замову, спаслаўшыся на занадта доўгае імя кліенткі. Джэніфер Абегунэвардэне замовіла паездку на Кіпр, аднак праз некалькі дзён ёй прыйшоў адказ, што замова анулаваная, паколькі ў яе імені занадта шмат літараў і яно не змяшчаецца ў адведзенае ў анкеце поле. Пасля гэтага турфірма папрасіла ў дзяўчыны прабачэння і цалкам кампенсавала кошт замовы, аднак Джэніфер мяркуе, што яе правы былі парушаныя.

На возеры Трэвіс, штат Тэхас, ЗША, 60 пасажыраў катара апынуліся ў вадзе пасля таго, як стоўпіліся на адным борце пры спробе разгледзець адпачывальнікаў на нудысцкім пляжы. Як расказалі відавочцы, калі катар набліжаўся да Даліны Хілі, дзе размешчаны адзіны публічны нудысцкі пляж у Тэхасе, усе пасажыры перамясціліся на адзін бок і выклікалі крэн судна. Катар перакуліўся і затануў на глыбіні 15 м. Ахвяраў не было.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

БЕЛАРУСБАНК

ОФИЦИАЛЬНАЯ ТАБЛИЦА

выигрышей 1-го тиража по срочным банковским вкладам в белорусских рублях «Шанс», проведенного 09.07.2010 г. в ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32.

Выигрыши выпали на следующие номера лицевых счетов срочных банковских вкладов в белорусских рублях «Шанс»:

№ п/п	Номер лицевого счета	Номер филиала, ЦБУ и отделения ОАО «АСБ Беларусбанк»			Наименование выигрыша
1	112000010	633		633	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
2	112000003	201		126	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
3	112000001	208		066	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
4	112000007	606		606	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
5	112000003	511		214	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
6	112000006	633		633	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
7	112000002	527		209	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
8	112000002	416	411	411	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
9	112000003	510		257	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
10	112000007	802		802	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
11	112000001	500	611	004	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
12	112000005	503		290	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
13	112000001	121	119	088	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
14	112000002	216		079	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
15	112000003	606		010	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
16	112000002	500		358	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
17	112000002	413		043	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
18	112000013	323		323	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
19	112000003	400	415	415	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
20	112000001	300		134	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
21	112000016	511		198	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
22	112000001	121	124	142	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
23	112000001	426		079	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
24	112000001	500	626	085	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
25	112000002	300		119	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
26	112000001	510		274	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
27	112000001	121	119	103	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
28	112000002	216		216	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
29	112000002	400		065	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
30	112000004	400		057	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
31	112000001	300	309	015	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
32	112000001	413		043	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
33	112000004	510		202	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
34	112000004	300	303	303	Печь СВЧ производства ОАО «Горизонт»
35	112000002	802		017	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
36	112000001	503		503	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
37	112000002	302		302	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
38	112000001	322	319	319	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
39	112000002	606		606	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
40	112000003	718		118	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
41	112000001	700	723	723	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
42	112000002	500	626	097	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
43	112000001	527		255	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
44	112000001	606		043	Стиральная машина производства ЗАО «Атлант»
45	112000002	121	124	137	Холодильник производства ЗАО «Атлант»

Председатель комиссии: заместитель директора департамента внутреннего аудита ОАО «АСБ Беларусбанк» — С.М. Марковец

Ответственный секретарь: главный специалист департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк» — Н.В. Корбут

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2009 г., млн. бел. руб.

	январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2009 год
Вклады до востребования	14,1	73,7	360,4	210,9	168,2	341,1	840,4	968,5	858,2	730,7	994,2	54947,5	60507,8
в том числе: в белорусских рублях	13,5	72,2	358,2	208,5	165,8	337,5	835,2	963,8	852,7	726,5	990,2	54875,4	60399,4
в иностранной валюте	0,6	1,5	2,2	2,4	2,4	3,6	5,2	4,7	5,5	4,2	4,0	72,1	108,4
Срочные депозиты	65366,4	84747,8	99573,7	96978,9	74407,6	103899,5	86888,3	88895,2	93119,3	81314,9	102613,9	128683,1	1106488,8
в том числе: в белорусских рублях	40602,5	55379,7	61011,0	61400,6	41672,6	63738,9	53377,1	55800,9	58435,2	51325,4	70984,0	86554,4	700282,5
в иностранной валюте	24763,9	29368,1	38562,7	35578,3	32735,0	40160,6	33511,2	33094,3	34684,1	29989,5	31629,9	42128,7	406206,3

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Дзевятнаццаць прадпрыемстваў будуць вынесены за межы Мінска да 2020 года

Дзевятнаццаць прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі Мінска, будуць вынесены за межы горада да 2020 года, паколькі яны не адпавядаюць рэгламентам генеральнага плана сталіцы. Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства эканомікі.

У спіс «вымушаных пераселенцаў» увайшлі: ВРУП «МЗКР», РУП «Станкабудаўнічы завод імя С.М. Кірава», філіял «Птушкафабрыка імя Крупскай» ААТ «1-я Мінская птушкафабрыка», РУП «Аэрапорт Мінск-1»(дэпартамент па авіяцыі), РУП «Мінскі авіярамонтны завод», ААТ «Дражджавы камбінат», ВГРУП «Мінск Крышталь», Мінскае абутковае ААТ «Прамень», ААТ «Галантэя», ААТ «Мінскі эксперыментальна-фурнітурны завод», ААТ «Сукно», ААТ «Беларускія шпалеры», ААТ «Мінскмэбля», РДВУП «Мінская друкарня», РУП «Выдавецтва Беларускі Дом друку», ВРУП «Будтэх», ААТ «Доследна-эксперыментальны завод тэхналагічнага абсталявання», філіял УП «Мінскаблгаз» Мінскае РВУ, ДВА «Белпалівагаз», ААТ «Мінскпраектмэбля».

Рашэнне аб перасяленні гэтых прадпрыемстваў прадугледжана Дзяржаўнай праграмай па будаўніцтве буйных жылых раёнаў для жыхароў Мінска ў гарадах-спадарожніках і вынасу (пераносу) са сталіцы ў населеныя пункты рэспублікі вытворчых аб'ектаў, якія не адпавядаюць рэгламентам генплана Мінска і падлягаюць да 2020 года вынасу (пераносу) на іншыя вытворчыя пляцоўкі (прамысловыя зоны) Мінска або за яго межы ў іншыя населеныя пункты краіны. Праграма зацверджана пастановай Савета Міністраў № 976 ад 29 чэрвеня 2010 года.

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

С 14 июля 2010 года на основании Постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 06.07.2010 № 277, размер ставки рефинансирования установлен – 11,5 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 на 0,5 процентного пункта с 15 августа 2010 года.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, MTC) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь

КАМУ ПРЫВОЛЬНА Ў СЕЦІВЕ ЗА НАШ КОШТ?

На працягу паўтара года 18-гадовы жыхар Мазыра ажыццяўляў несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі.

Як расказаў **начальнік аддзела па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр КУЛАГА,** малады чалавек з 1 студзеня да 20 красавіка мінулага года метадам сканавання сеткі з выкарыстаннем спецыялізаванага праграмнага забеспячэння падключаўся да мадэмаў законных карыстальнікаў у сусветным сеціве. Затым абыходзіў сістэмы абароны мадэмаў і такім чынам атрымліваў доступ да месту 23 ідэнтыфікатараў (логін, пароль) законных карыстальнікаў інтэрнэту. У тым ліку ён змог атрымаць ідэнтыфікатары журналістаў віцебскага карпункта БелТА. Юны хакер бадзяўся па прасторах сусветнага павуціння са свайго асабістага камп'ютара за кошт іншых. Акрамя таго, ён ажыццяўляў несанкцыянаваны доступ да хатніх старонак карыстальнікаў на інтэрнэт-рэсурсе byfly з мэтай атрымання інфармацыі аб тарыфным плане і стане асабовых рахункаў. Негледзячы на тое, што ў дзеяннях мазыраніна былі прыкметы складу злачынства, прадугледжанага ч.2 артыкула 349 Крымінальнага кодэкса Беларусі, у дачыненні да яго было адмоўлена ва ўзбуджэнні крымінальнай справы па нерэабілітуючых падставах згодна з Законам «Аб амністыі ў сувязі з 65-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» ад 7 мая 2009 года.

І гэта не адзіны факт хакерства. У дачыненні да 22-гадовага гамяльчаніна зусім нядаўна заведзена крымінальная справа па аналагічным артыкуле. Акрамя таго, інкрымінуецца яму і неправамернае авалодванне камп'ютэрнай інфармацыяй. Грамадзянін па просьбах сябра з хатняга камп'ютара і ўстаноўленай на ім спецыялізаванай праграмы незаконна выходзіў на сервер аднаго з гомельскіх інтэрнэт-правайдараў. Яго цікавіла інфармацыя пра логіны абанентаў на доступ у сеціва, балансы асабовых рахункаў, IP-адрасы, выданыя ім у лакальнай сетцы, MAC-адрасы сеткавага абсталявання і адрасы пражывання карыстальнікаў. Потым атрыманую інфармацыю ён перадаваў таварышу. Цяпер яго чакае суд.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЕМ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА:

НАИМЕНОВАНИЕ, МЕСТОПОЛОЖЕНИЕ, ЦЕЛЕВОЕ НАЗНАЧЕНИЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА:
для строительства магазина, расположенного по адресу: Минская область, г. Мядель, ул. Нарочанская, площадью 0,0787 га (кадастровый номер 624050100001001442) с начальной ценой 4 495 344 рубля.

Срок аренды земельного участка: 99 лет.

Сумма задатка: 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ПРОДАВЕЦ – Мядельский районный исполнительный комитет.

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – СИКУП «УКС-СЕРВИС».

Условие и порядок оплаты победителя аукциона: разовый, безналичный платеж в размере цены продажи объекта за вычетом задатка на р/с Мядельского райфинотдела № 3602623001908 в ф-ле № 632 АСБ «Беларусбанк», г. Вилейка, код 260, УНН 600097132, код платежа 4002 в течение 20 рабочих дней со дня получения протокола аукциона.

Сумма компенсации затрат на организацию и проведение аукциона: на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС» согласно протоколу аукциона.

Победитель аукциона возмещает затраты на формирование земельного участка, государственную регистрацию, а также расходы, связанные с опубликованием извещения об аукционе в средствах массовой информации согласно протоколу аукциона.

ДОКУМЕНТЫ, ПРЕДОСТАВЛЯЕМЫЕ ДЛЯ УЧАСТИЯ В АУКЦИОНЕ – заявление на участие, заверенная банком копия платежного документа на внесение задатка; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и его копию.

КОНЕЧНЫЙ СРОК ПРИЕМА ЗАЯВЛЕНИЯ – 13.08.2010 г. до 16.00.

АДРЕС, ПО КОТОРОМУ ПРИНИМАЮТСЯ ЗАЯВЛЕНИЯ – г. Молодечно, ул. Мира, д. 15, к. 1.

ДАТА, ВРЕМЯ, МЕСТО И ПОРЯДОК ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА – 16.08.2010 г. в 15.00 по адресу: г. Молодечно, ул. Мира, д. 15 СИКУП «УКС-СЕРВИС».

Тел. для справок: 8 (0176) 75 16 09, 8 (044) 710 74 60.

Віншуем з 35-годдзем ***ДЖУМАНГАЛІЕВУ Аксану*** *з г. Петрыкава. Здароўя, шчасця, сямейнага дабрабыту, усіх даброт.*

Бацькі, сястра, браты, муж, дзеці і пляменнікі.

Твае правы

КАЛІ МОГУЦЬ ПАЙСЦІ НА ПЕНСІЮ БАЦЬКІ ДЗІЦЯЦІ-ІНВАЛІДА?

Сяргей ГРЫБ

Ільготы, пенсія, а ў пэўных варунках — магчымасць атрымліваць дзіцячую дапамогу да 18 гадоў, дапамогу на догляд ці адрасную сацыяльную дапамогу. Напрамкаў падтрымкі сем'яў, якія маюць дзяцей-інвалідаў, можа быць адразу некалькі. І ў тым ліку не сакрэт: адзін з бацькоў, які выхоўвае дзіця з абмежаванымі магчымасцямі, мае права на датэрміновую пенсію па ўзросце. Праўда, у такім выпадку ўсё ж ёсць некаторыя акалічнасці. І разабрацца з імі мы паспрабуем з дапамогай намесніка начальніка аддзела прызначэння і выплаты пенсій камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вольгі ШЫНГІРЭЙ.

«МІНУС» ПЯЦЬ ГАДОЎ. АЛЕ З УМОВАМІ

Для пачатку трэба адзначыць: жанчына, якая мае дзіця-інваліда, незалежна ад вызначанай яму ступені страты здароўя мае права выйсці на пенсію ў 50 гадоў пры дзвюх аднолькава важных умовах. Першая з іх — выхаванне дзіцяці-інваліда на працягу не менш чым 8 гадоў да яго паўналецця. А другая — наяўнасць не менш чым 20-гадовага стажу.

— У пэўных варунках магчымасць афарміць пенсію раней, у 55-гадовым узросце, мае і бацька дзіцяці-інваліда, — распавядае Вольга Шынгірэй. — У гэтым выпадку таксама неабходна не менш чым 8-гадовае выхаванне гэтага дзіцяці. Аднак паказчык неабходнага стажу для мужчыны павялічваецца да 25 гадоў. І ці не галоўнае — для прызначэння датэрміновай пенсіі бацьку патрэбна, каб права на яе мела маці, якая гэтым правам па тых або іншых прычынах не скарысталася.

ДАКУМЕНТЫ. ПЛЮС ВІЗІТ ДАДОМУ

Патрабаванне не менш чым 8-гадовага выхавання да паўналецця абавязковае. Прычым зразумела, што ў гэты перыяд не ўключаюцца гады, якія дзіця правяло ў доме-інтэрнаце або ў якой-небудзь іншай установе на дзяржаўным забеспячэнні. Аднак можна заўважыць, што наведванне дзіцем таго ж дзённага аддзялення ў тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў час выхавання залічыцца. Бо зноў жа: дзіця знаходзіцца ў такім аддзяленні толькі ўдзень, што не выключае яго выхавання бацькамі.

— Увогуле факт выхавання дзіцяці-інваліда вызначаецца раённай камісіяй па прызначэнні пенсій, — тлумачыць Вольга Шынгірэй. — Сюды падаюцца неабходныя пацвярджальныя дакументы, а плюс да таго спецыялісты ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне павінны выйсці на месца і шляхам апытання сведак «праверыць» інфармацыю яшчэ раз. Трэба адзначыць, што тут могуць узнікнуць пэўныя цяжкасці — у выпадку, калі раней сям'я з дзіцем-інвалідам жыла за межамі нашай краіны.

СТАЎКА — ЗУСІМ НЕ ГАЛОЎНАЕ

Асобная гаворка пра стаж. Увогуле, нейкіх асаблівасцяў яго падліку не існуе, па сутнасці тут працуе «стандартны» падыход — да ўвагі прымаецца працоўная дзейнасць, навучанне на дзённых аддзяленнях з атрыманнем прафесіі, догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, догляд дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў і (як правіла, у дачыненні да бацькі) служба ў арміі.

Словам, залічваюцца ўсе так званыя «крэдытныя перыяды». І ўсё ж назбіраць неабходны для афармлення датэрміновай пенсіі стаж выключна з іх немагчыма. У прыватнасці, заканадаўства вызначае: права на пенсію па ўзросце дае не менш чым 5-гадовая выплата ўзносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне. Інакш кажучы, як мінімум тыя ж 5 гадоў трэба менавіта адпрацаваць.

Між тым, працаваць бацькам, якія выхоўваюць дзіця з абмежаванымі магчымасцямі, заўсёды складана. А ў сувязі з гэтым і ўзнікае пытанне: ці прымаецца да ўвагі занятасць на 0,5 ці на 0,25 стаўкі?

— У прынцыпе, сам «памер» стаўкі пры падліку стажу вялікай ролі не адыгрывае, — падкрэслівае Вольга Шынгірэй. — Аднак нялішне заўважыць, што залік года работы за год стажу пасля ліпеня 1998 года робіцца толькі ў выпадку, калі грамадзянін атрымліваў большую за «мінімалку» заплату. Калі ж заробак быў ніжэйшы за «мінімалку», то пры заліку стажу выкарыстоўваецца памяншальны паправачны каэфіцыент.

НЯВЫГАДНЫ ЗАРОБАК МОЖНА «ЗАМЯНІЦЬ»

Непасрэдна памер датэрміновай пенсіі аднаму з бацькоў, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, залежыць як ад стажу, так і ад памеру ранейшага заробку. Аднак тут таксама ёсць адзін цікавы нюанс.

— Напрыклад, можа ўзнікнуць сітуацыя, калі маці ці бацька вучыліся на дзённым аддзяленні і адначасова працавалі з вельмі маленькай зарплатай, — заўважае Вольга Шынгірэй. — У такім разе ёсць магчымасць залічыць у стаж не работу, а навучанне — і, адпаведна, выключыць гэты час працоўнай дзейнасці з разліку індывідуальнага каэфіцыента. Зрэшты, у любым выпадку тут трэба рабіць індывідуальныя падлікі. І выбраць больш выгадны варыянт могуць дапамагчы ў раённым упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

ПЕНСІЯ — НЕ ЗАБАРОНА НА РАБОТУ

Для афармлення датэрміновай пенсіі па ўзросце аднаму з бацькоў, які выхоўваў дзіця-інваліда, неабходна звяртацца ў тое ж упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства. Сюды падаецца заява, пашпарт, пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці, працоўная кніжка, памеры заробкаў, дыплом аб адукацыі і іншыя сведчанні «крэдытных» перыядаў стажу, а таксама дакументы, якія пацвярджаюць выхаванне дзіцяці-інваліда.

Пры гэтым адно з па-с

14

ЛІПЕНЯ
2010 г.
СЕРАДА
№ 26 (15629)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ШЛЯХ ДА СЭРЦА ЖУРЫ ПРАЗ...

УЧОРА ноччу скончылася першае конкурснае выступленне ўдзельнікаў міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2010». «Чортава лічба», спадзяёмся, нікому не перашкодзіла поўнасцю прадэманстраваць свой талент. Выступіць на знакамітай сцэне самай вялікай канцэртнай залы Еўропы пад адкрытым небам — у Летнім амфітэатры — гэта ўжо, пагадзіцеся, дасягненне і перамога. Тым больш што толькі пасля цябе і тваіх прыяцеляў і адначасова канкурэнтаў выступілі «зоркі». Прыемна. Той жа Ігар Карнялюк, Хелена Вондрачкава (Чэхія) і іншыя, а таксама сама старшыня журы конкурсу Таіса Павалій — народная артыстка Украіны. І якая розніца, што за лічба на календары?

НЕ РАССТАНУСЯ З ПІЯНЕРЫЯЙ

Сёння раніцай тэхнічна немагчыма паведаміць пра яўныя фаварытаў. Падзялюся ўражаннямі ад іх размоў і выступлення канкурсантаў на лёсаванні. Заўважыў: яшчэ на лёсаванні некаторыя хлопцы-канкурсанты (брунеты) літаральна пакарылі гледачоў, сярод якіх было нямала дам, скажам так,

Вольга ГАРЧЫНСКІ.

ад 45 і да... Апладзіравалі ім амаль што не ўстаўшы з крэслаў. Ці адаб'ецца гэта на ацэнках журы?

Нагадаю, што ўсяго ўдзельнікаў конкурсу 19. Упершыню за «Гран-пры» — а гэта ажно (або ўсяго толькі) 10 тысяч долараў — змагаецца канкурсантка з Кубы, 18-гадовая Данііўска Пачэка. Яна, дарэчы, самая маладая. Толькі выйшла з піянерскага ўзросту. Між іншым, як высветлілася, брала ўдзел у гала-канцэрце ў гонар... З'езда кубінскіх піянераў. Удзельнічала і ў фестывалі песні ў падтрымку навакольнага асяроддзя. Выконвае кубінскую, мексіканскую музыку. Звычайна журы вельмі стараецца цёпла, я сказаў бы, па-бацькоўску, ставіцца да самай (самага) маладога (маладой). А спонсары імкнуцца па выніках конкурсу нейкім чынам узнагародзіць «дзіця». І бываюць вельмі нядрэнныя спонсарскія прызы.

13-й выступае на конкурсе 23-гадовая Вольга Гарчынскі з Малдовы. На лёсаванне многіх уразіла яе выкананне — міні-спектакль. Уся такая ў белым, фата ляжыць на сцэне, у руках скрыпка... Спявала пра непадзеленае каханне.

МАЛАДЫ, АЛЕ ЖАНАТЫ

Нашаму канкурсанту Дзянісу Вяршэнка яшчэ не споўнілася 24. На конкурсе ён выступае трэцім, а марыў у другой дзясятцы. Ураджэнец Светлагорска, саліст прадзюсарскага цэнтра Гомельскай абласной філармоніі, як прызнаўся, у душы — рамантык і лірык. Таму выконвае на конкурсе «базару» лірыку. Яшчэ перад «базарам» заявіў, што выканае «Малітву» Дунаеўскага на словы Рэзніка, а таксама кампазіцыю «Птушкі» на верш беларускай паэткі Валянціны Паліканінай.

Трохі папсую настрой глядачкам-дзяўчатам. Наш хлопец жанаты. Калі падчас адказаў на пытанні журналістаў расказваў пра сваю жонку Іну — харэографа, якая па размеркаванні адпрацоўвае на Міншчыне з вясковымі дзецьмі, адразу стала зразумела: закаханы ва ўласную жонку. Пазнаёміліся з ёй у інтэрнаце. Цікава, што спачатку Дзяніс вучыўся ў Светлагорскім

Алівер КАЦІЧ.

індустрыяльным тэхнікуме (вельмі далёкім ад мастацтва), і ў 2006-м паступіў у сталічны ўніверсітэт культуры і мастацтваў на аддзяленне «Рэжысура масавых святаў і абрадаў». Наш зямляк — лаўрэат і пераможца конкурсаў у Беларусі і Расіі, у тым ліку і ў Сочы. Што дзіўна, музыкаў у іх сям'і не было. Бацька працаваў на малаказаводзе, мама — у гандлі.

САМЫЯ СТАРЫЯ МАЛАДЫЯ

Самы «стары» канкурсант — 32-гадовы прадстаўнік Сербіі Алівер Каціч. Ён — фіналіст нацыянальнага конкурсу «Еўрабачанне-2010». Чарнявы з грывай валасоў. Прыгажун! Дамы ў захапленні!

Амаль ягоны равеснік — 31-гадовы мужчына з Балгарыі Васіл Стаянаў. Як здалося не толькі мне, мужчына юны душой. Ён, нагадаю, так энергічна праспяваў «гімн чэмпіёнаў», што проста танцаваць хацелася і бегчы на стадыён.

Што тычыцца росту і целаскладу выканаўцаў — маю на ўвазе мужчын (бо жанчыны, вядома, усе прыгожыя, нягледзячы на рост і ўзрост), дык заўважыў адразу некалькі, скажам так, зусім не вялікана, за якімі жанчыны маглі б быць, як за каменнай сцяной. Вось 30-гадовы прадстаўнік Літвы з псеўданімам Дэйвіс. Бачылі б вы яго выканаўчую абласы на лакіраваных ботах! А які голас! Задор!

Высветлілася, што сярод маладых выканаўцаў (па ўмовах конкурсу ва ўзросце да 35 гадоў), аказваецца, ёсць і мама. Гэта Іна Воранава з Украіны, якой 23 гады. Яна родам з Луганска. Разам з бацькамі ў складзе групы «Рандэву» шмат гастралявала. Перамагла ва ўкраінскім праекце вакальных выканаўцаў. Дзякуючы гэтаму была накіраваная на стажыроўку ў Галівудскую поп-акадэмію ў Лос-Анджэлесе. «Ды яна на нашу Афанасьеву так падобная», — абмяняліся мы ўражаннямі з калегай. А наша «зорка», дарэчы, член журы.

Як і Ігар Карнялюк. Мо выпадкова таму 27-гадовая прадстаўніца Расіі Ганна Малышава на канцэрце лёсавання выканала ягоны шлягер «Я развучыўся лётаць». Дык яна ж з Піцера — зноў «якое супадзенне»...

Калі ўчора канкурсанты выступалі пад фанаграму («-1»), то сёння аб адзінаццатай гадзіне ночы пачнуць выступаць у суправаджэнні Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі. Наш канкурсант, дарэчы, адзначыў: «Доўгі час трэніраваўся пад кіраўніцтвам спачатку Ірыны Дарафеевай, потым маэстра Фінберга». Вядома, яму будзе лягчэй паказаць клас у суправаджэнні «свайго» аркестра. На што вельмі будзем спадзявацца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота БЕЛТА.

Дзяніс ВЯРШЭНКА.

Стыпендыі лепшым студэнтам

Спецыяльныя стыпендыі канцэрна «Беллегпрам» будуць выплачаны студэнтам Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Баранавіцкага дзяржаўнага каледжа лёгкай прамысловасці і Мінскага дзяржаўнага каледжа тэхналогіі і дызайну лёгкай прамысловасці. Па выніках сесіі іх адпаведна атрымаюць студэнткі 5 курса Марына Смаль і Наталля Міхайлава (Віцебск) і навучэнкі 4 курса Таццяна Худзік (Баранавічы) і Іна Глухоўская (Мінск). Выпускніцы гэтых трох навучальных устаноў удастоеныя спецыяльнай стыпендыі канцэрна за выдатную вучобу, удзел у выкананні навукова-даследчых работ па тэматыцы канцэрна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Іспыт пад назвай «творчасць»

Для беларускіх абітурыентаў зараз гарачая пара — вышэйшыя навучальныя ўстановы адчынілі дзверы для будучых студэнтаў. У Акадэміі музыкі (на здымках), як і ва ўсіх творчых ВНУ, час прыёму дакументаў ужо скончыўся, але наперадзе яшчэ самае адказнае — уступныя экзамены тут будуць здаваць да 23 ліпеня.

Усе астатнія ВНУ Беларусі будуць прымаць дакументы на ўсе формы навучання з 16 па 25 ліпеня. Дарэчы, сёлета абітурыенты могуць выбраць з 55 вышэйшых навучальных устаноў, а білетаў першакурснікам запланавана выдаць больш за сто тысяч.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Абітурыенты, выпускнікі гімназіі-каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі, праходзяць кансультацыю па спецыяльнасці дырыжыраванне.

Рыхтуемся да школы

85 працэнтаў мадэляў школьнага адзення — навінкі

Канцэрн «Беллегпрам» паставіць да школьнага сезону ў крамы краіны 710 тысяч вырабаў школьнага адзення на суму 28,4 мільярда рублёў. Гэты аб'ём узгоднены з міністэрствамі гандлю і адукацыі.

Па ўзгадненні з Міністэрствам гандлю, 20 працэнтаў ад гэтай колькасці паступіла ў гандлёвыя арганізацыі ў чэрвені, 50 працэнтаў будзе пастаўлена на працягу ліпеня, і 30 працэнтаў паступіць у жніўні. На сёння, паводле інфармацыі прэс-службы канцэрна, у крамах маецца больш за 493 тысячы вырабаў школьнага адзення: больш за 120 тысяч для дзяўчынак і больш за 372 тысячы — для хлопчыкаў. Да 20 жніўня «Беллегпрам» мае намер паставіць у крамы яшчэ амаль 142 тысячы вырабаў. Па просьбе гандлёвых арганізацый швейныя прадпрыемствы галіны вырабяць і паставяць 15 працэнтаў адзення, якое было запатрабаванае ў мінулым сезоне.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У крамы паступіць адзенне, што вырабяць для школьнікаў 15 айчынных прадпрыемстваў. Сёлета яны прадставілі больш за 150 мадэляў адзення для школьнікаў, з якіх каля 100 прызначаныя для дзяўчынак. Гэта розныя камплекты, жакеты, штаны, сарафаны, спадніцы, кашулі і камізэлькі. 85 працэнтаў адзення — гэта новыя мадэлі ў дзелавой каляровай гаме (бардо, цёмна-сіні і чорны). Для вытворчасці адзення для дзяцей школьнага ўзросту прадпрыемствы канцэрна выкарыстоўваюць тканіны, што адпавядаюць патрабаванням санітарных правілаў і нормаў. Шыюць касцюмы з паўшарсцяных тканін, паўшарсцяных з укладаннем эластану, полівіскозных, вельветавых (100-працэнтная бавоўна); кашулі — з баваўняных тканін і з укладаннем хімічных валокнаў; кашулі для дзяўчынак — баваўняных тканін і поліэфірных (для ўрачыстых момантаў), трыкатажнага палатна з укладаннем віскозы і лайкры.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«БАЗАРНЫ» ЛЁН: прыгажуні яшчэ прывабней

Высокія прыгажуні-манекеншчыцы з блакітнымі вачамі, прыгожы колер якіх так добра «падкрэслівае» адзенне з натуральнага лёну, ільняныя кірмаш і застолле — усё гэта было на свяце лёну на «базары». Як і распродаж сувеніраў, конкурсы для тых, хто прыйшоў на льняную акцыю. Шыкоўнае і маштабнае свята «беларускага шоўку» — лёну ўпершыню адбылося на «базары» ў Віцебску на плошчы Перамогі.

Некаторыя строі, якія дэманстравалі на сцэне, літаральна змялі пакупнікі на льняным кірмашы. Добра куплялі і абутак, зроблены з прымяненнем ільняных матэрыялаў. Праўда, хочацца пажадаць вытворцам з Ліды, каб іх дызайнеры лепш падумалі наконт таго, што кеды — гэта добра, але ж можна зрабіць больш прывабны і разнастайны абутак для тых, хто хоча ў льняным абутку не толькі спортам займацца.

Верагодна, на ўнясенне ў «Кнігу рэкордаў Гінэса» зможа прэтэндаваць гіганцкае льняное палатно плошчай 20 квадратных метраў, якое распісалі ўсе ахвотныя.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прашу слова

ЯК ПАДЗЯЛІЦЬ НА ЎСІХ КАРОТКУЮ КОЎДРУ?

АГУЛЬНАВЯДОМА, што заработная плата ў настаўнікаў — сціплая. Але і пры такой, не вельмі высокай, зарплаце ўзнікае шмат пытанняў па яе налічэнні. Адным з матэрыяльных стымулаў для педагогаў з'яўляецца атрыманне кваліфікацыйнай катэгорыі. Кваліфікацыйныя катэгорыі прысвойваюцца атэстацыйнымі камісіямі пасля падачы настаўнікам заявы і прыняцця камісіяй адпаведнага рашэння. Гэта ў многім стымулюе працу настаўніка. Аднак розныя агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы маюць розныя статусы: у сістэме адукацыі функцыянуюць сярэднія школы, гімназіі, ліцэі і інтэрнаты. У залежнасці ад прыналежнасці настаўніка да адной з гэтых устаноў розніца ў памеры заработнай платы можа быць да 20 працэнтаў пры адной і той жа катэгорыі. Гэта вельмі істотная розніца ў заробках, прычым не заўсёды справядлівая.

Многія настаўнікі звычайных школ на працягу многіх гадоў рыхтуюць прызёраў раённых, абласных і рэспубліканскіх школьных алімпіяд, апярэджваючы сваіх калег з гімназій і ліцэяў. Менавіта на гэтых настаўнікаў я і хацеў бы звярнуць увагу. Калі ў школе толькі некалькі пераможцаў, то пытанне прэміявання гэтых настаўнікаў можна вырашыць за кошт сродкаў прэміяльнага фонду. А калі пераможцаў шмат? У гэтай сітуацыі праблема школы ператвараецца ў праблему «кароткай коўдры», калі, даючы прэміі адным, ушчамляюцца ў прэміяванні іншыя. І пры гэтым паўстае відавочнае пытанне: чаму звычайны настаўнік гімназіі і ліцэя атрымлівае заробкі на 15—20 працэнтаў большыя, не маючы такіх вынікаў, якія ёсць у настаўнікаў звычайных школ?

Я ведаю вельмі шмат настаўнікаў сярэдніх школ, чые вучні з года ў год вельмі паспяхова выступаюць на раённым, абласным і рэспубліканскім этапах алімпіяды, але на іх заробках гэта ніяк не адбіваецца. Трэба штосьці тэрмінова змяняць. Я лічу, што ні ў якім разе нельга вырашаць пытанне з заахвочваннем настаўнікаў, якія рыхтуюць пераможцаў алімпіяд, са школьнага прэміяльнага фонду, каб не ўшчаміць інтарэсы іншых педагогаў, якія таксама прымаюць актыўны ўдзел у метадычнай, навуковай і іншай рабоце сваёй навучальнай установы. Гэтыя настаўнікі павінны заахвочвацца па спецыяльным артыкуле са спецыяльнага цэнтралізаванага фонду. Прапаную наступную схему заахвочвання педагогаў:

Дыплом I-й ступені на раённай алімпіядзе — 15 % круглы год ад месяца, калі праводзілася алімпіяда; дыплом II-й ступені — 12 %; дыплом III-й ступені — 10 %.

Калі настаўнік падрыхтаваў прызёраў I—III ступені раённай алімпіяды тры і больш разоў — прыраўняць яго стаўку да стаўкі выкладчыка гімназіі на пастаяннай аснове.

Дыплом I-й ступені на вобласці — 30 % круглы год ад месяца, калі праводзілася алімпіяда; дыплом II-й ступені — 25 %; дыплом III-й ступені — 20 %.

Калі настаўнік падрыхтаваў прызёраў I—III ступені абласной алімпіяды тры і больш разоў — прыраўняць яго стаўку да стаўкі выкладчыка ліцэя на пастаяннай аснове.

Дыплом I-й ступені на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды — 50 % круглы год ад месяца, калі праводзілася алімпіяда; дыплом II-й ступені — 45 %; дыплом III-й ступені — 40 %.

Калі настаўнік падрыхтаваў прызёраў I—III ступені на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды тры і больш разоў, павялічыць яго стаўку на 45 % на пастаяннай аснове.

Гэтыя выплаты павінны рабіцца з рэспубліканскага фонду. Як паказвае вопыт, мясцовыя ўлады фінансуюць працу такіх настаўнікаў па рэшткавым прынцыпе — спрабуюць падзяліць на ўсіх «кароткую коўдру»... Хочацца прыгадаць добрым словам былога мэра горада Мінска Міхаіла Паўлава, які ва ўсім падтрымліваў таленавітую моладзь і выдатных педагогаў.

Гомельская вобласць у гэтым годзе заняла па выніках рэспубліканскай алімпіяды першае месца ў краіне. Затое цяпер у кіраўнікоў вобласці праблема і галаўны боль: як заахвоціць усіх вучняў і настаўнікаў, якія іх падрыхтавалі? Вось калі радасць ад перамогі ператвараецца ў фінансавую праблему — праблему «кароткай коўдры».

З павагай, Анатоль САФОНАЎ.

Чыгунка — месца сустрэч і надзей

ТАК было, ёсць і будзе. Дзякуючы ёй, людзі знаходзяць сяброў, бачаць свет. Яна нават можа перайначыць жыццё чалавека. Дзіцячая мінская чыгунка — гэта таксама свой чароўны сусвет, асобная планета. Тут пануе атмасфера ўсмешак і захаплення. На дзіцячай чыгунцы амаль ўсё сапраўднае. Яна адрозніваецца ад «вялікай» толькі шырынёй каляіны і ўзростам чыгуначнікаў, якіх працуе на мінскай дзіцячай чыгунцы каля 500. Узрост іх — ад 11 да 15 гадоў.

Сёлета дзіцячай чыгунцы спаўняецца 55 гадоў. З 1971 года яна называецца «Мінская дзіцячая чыгунка імя Канстанціна Заслонава» — у гонар легендарнага беларускага партызана-чыгуначніка, Героя Савецкага Саюза. А галоўная станцыя «Парк Культуры» перайменавана ў «Заслонава». Менавіта тут пачынаецца падарожжа па дзіцячай чыгунцы. Сезон адкрываецца 1 мая і заканчваецца ў апошні тыдзень верасня. Як і на дарослай чыгунцы, цягнікі рухаюцца строга па раскладзе. Тут 3 станцыі: «Заслонава», «Піянерская» і «Сасновы бор», яе даўжыня — 4 км.

Пасадка пасажыраў — на станцыі «Заслонава», што недалёка ад станцыі метро Парк Чалюскінцаў. Тут гучыць музыка з вядомых дзіцячых мульфільмаў: «Віні-Пуха», «Мамы для маманцяняці», «Брэменскіх музыкантаў» і г. д. На пероне з дзецьмі размаўляюць вялікія Пчала і Тыгр. Можна пасядзець на лавачцы, купіць штосьці смачнае, пракаціцца на «Вясёлай горцы». У будынку ёсць зала чакання, білетныя касы, памяшканне дзяжурнага па станцыі, інструктарская, а таксама прыгожы макет чыгункі. Дарэчы, макет рабілі самі юныя чыгуначнікі.

Яны загадзя рыхтуюцца да кожнай паездкі: праваднікі ўважліва аглядаюць вагоны, машыністы занятыя сваёй справай, начальнік змены правярае, ці ўсе на месцы. І вось наступае чаканая хвілінка адпраўлення: уздрыгваюць вагоны, стукаюць колы, і цягнік павольна рушыць наперад. Па дарозе юныя пасажыры слухаюць гісторыю чыгункі, песні. Наступная станцыя — «Піянерская». Гэта тэхнічная станцыя, таму пасажыры тут не выходзяць, але працуюць дзяжурныя па пераездзе.

Нарэшце апошні прыпынак — «Сасновы бор». Станцыя размешчана ў прыгожай лесапаркавай зоне. Раней тут стаяў драўляны будынак, але быў знішчаны агнём. Замест яго пабудаваныя навес і невялікая сцэна, дзе праводзяцца цікавыя прадстаўленні ў святочныя дні (зімой, напрыклад, сустрэчы са Снягуркай, Дзедам Марозам, Бабай Ягой). Ёсць таксама спецыяльны цягнік для маладажонаў.

Для маленькіх пасажыраў гэтае падарожжа — цікавая забава, а для юных чыгуначнікаў — практыка, сапраўдная праца. Бо дзіцячая чыгунка — установа дадатковай адукацыі падлеткаў. Хлопчыкі і дзяўчынкі вывучаюць чыгуначныя спецыяльнасці. З лістапада па красавік яны праходзяць тэарэтычны курс, у красавіку здаюць залікі і экзамены. Май — верасень прызначаны для практычнага замацавання атрыманых ведаў, а ў кастрычніку — заслужаны адпачынак. Пачынаюць вучобу на чыгуначнікаў вучні з 5-га класа. Асноўная праграма разлічана на 3-4 гады, але многія займаюцца і больш. Першы год — уводны курс: вучням тлумачаць, што такое чыгунка, яе тэхнічнае аснашчэнне. А далей ідуць больш паглыбленыя веды. Тэорыю засвойваюць у вучэбным цэнтры Дзіцячай чыгункі. Кожнае памяшканне прафіляванае па асноўных цягнікових спецыялізацыях: «Вагонная гаспадарка», «Лакаматыўная гаспадарка», «Пуцявая гаспадарка», «Арганізацыя перавозак і бяспечнасць руху цягнікоў». Увогуле, юныя чыгуначнікі асвойваюць каля 30 вучэбных дысцыплін: вучацца на машыніста, памочніка машыніста, дзяжурнага па станцыі, аператара, дыспетчара, дыктара, правадніка, рэвізора, начальніка вакзала, начальніка цягніка.

Дзмітрый Чарноў, вучань 10 класа, наведвае вучэбны цэнтр пяты год. Зараз працуе начальнікам змены і старшынёй савета юных чыгуначнікаў адначасова. На чыгунцы ёсць 4 змены, у кожнай каля 100 чалавек. З гэтых 100 чалавек толькі адзін дарослы — інструктар. Ён мае двух намеснікаў. Каб заняць гэтую пасаду, неабходна правучыцца не менш за два гады. І вось сёння Дзмітрый з'яўляецца адным з намеснікаў інструктара. Хлопец выступае на планёрках, праводзіць інструктаж, паведамляе пра змяненні, прызначае людзей на рабочыя месцы, запаўняе рапарт.

— Я з дзяцінства люблю чыгунку. Яна нават была адным з першых маіх слоў, — расказвае Дзіма. — Мама прывяла мяне сюды, калі я вучыўся ў чацвёртым класе. Але з-за ўзросту мяне не прынялі, прыйшлося чакаць цэлы год. Цяпер хлопец марыць паступіць у чыгуначны каледж. Для гэтага ёсць усе падставы. Пасля заканчэння вучэбнага цэнтра юных чыгуначнікаў можна атрымаць мэтавае накіраванне ў Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж чыгуначнага транспарту.

Грошы за працу юныя чыгуначнікі не атрымліваюць. Але для іх арганізоўваюцца турыстычныя экскурсійныя паездкі (неўзабаве, напрыклад, паедуць у Санкт-Пецярбург на тры дні), злёты, турысцкія паходы. На чыгунцы вучыцца моладзь з Мінска, Бабруйска, Маладзечна, Барысава і іншых мясцін. Сезонная практыка — гэта прыкладна 25 заняткаў. Дождж ці сонца, сумна альбо весела... чыгуначнікі заўсёды на месцы, яны з адказнасцю ставяцца да працы. Школьнікі сапраўды атрымліваюць задавальненне ад працы на чыгунцы, а многія нават знаходзяць сваё прызванне.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Наталля ШЧУРКА.

Фота БЕЛТА.

Моладзь Беларусі прадставіла на «Славянскім базары» ўсе кірункі сваёй культуры. Эпіцэнтрам усіх падзей стаў парк Фрунзе, які на адзін дзень пераўтварыўся ў нясумную вуліцу. Лепшыя прадстаўнікі розных моладзевых субкультур прадставілі тут сваё майстэрства. Арганізатарам Дня моладзі выступіў БРСМ.

ЗОРКІ З НЕБА НЕ ПАДАЮЦЬ

Тут ведаюць, што зоркі з неба не падаюць. І што загадваем мы жаданні зусім не пад знічкі, а пад метэорныя целы, якія згараюць, трапляючы ў зямную атмасферу. У розныя месяцы года бываюць розныя метэорныя плыні, часам вельмі яскравыя, прыгожыя. А калі гэта відовішча цікава назіраць няўзброеным вокам, дык што ж можна пабачыць у тэлескоп.

Відаць, штат прыхільнікаў у такой навукі, як астраномія, — адзін з самых вялікіх: на аднаго навукоўца прыпадае з дзясятак аматараў, якія назіраюць за зорным небам, займаюцца даследаваннямі. У нашай краіне няма навучальных устаноў, якія б прымалі абітурыентаў на спецыяльнасць астраномія (хоць беларусы спасцігалі гэту навуку за мяжой і зрабілі свой унёсак у яе развіццё, імёнамі некаторых названыя кратары на Месяцы). У савецкія часы, калі гэта галіна развівалася, у нас не будавалася навуковых цэнтраў (у Беларусі абсерваторыі ствараліся ў асноўным з мэтай папулярызацыі астраноміі). Але нягледзячы на ўсё гэта і нават на тое, што клімат у Беларусі зусім неспрыяльны для такога хобі (ясных, прыдатных для вывучэння зорнага неба дзён выпадае ўсяго 50-60 на год), колькасць яго прыхільнікаў паступова павялічваецца. Ёсць у Беларусі людзі, якія фатаграфуюць спадарожнікі і нябесныя целы, займаюцца пошукам камет, даследаваннем іх траекторый. Мінулым летам адзін з аматараў астраноміі, у якога ёсць прыватная абсерваторыя, адкрыў першы беларускі астэроід.

Апошнім часам дзякуючы развіццю інтэрнэту назіраць за зоркамі становіцца ўсё больш цікава: бо праз камп'ютар можна «выкрыць» сваіх калег, абменьвацца інфармацыяй на форумах, дамаўляцца аб сустрэчах, каб праводзіць даследаванні разам. Аматары астраноміі ладзяць Беластрафэсты, выязджаюць за горад, дзе лепш назіраць за зорным небам. Гарадская ілюмінацыя не дае магчымасці разгледзець усе аб'екты, ды што там: сталічныя жыхары, відаць, ужо і забыліся, як выглядае Млечны шлях.

Астраномія становіцца і тэхнічна больш даступнай, няма праблем з тым, каб набыць тэлескопы, напрыклад, кітайскія каштуюць 200—300 долараў. Зразумела, такіх неверагодных малюнкаў, якія выстаўляюцца часам у інтэрнэце (яны зроблены з магутнай дарагой тэхнікі), з кітайскага тэлескопа не пабачыш. Але нават з яго можна паназіраць за Месяцам і іншымі планетамі, яркімі каметамі (калі ёсць іх пралёт), галактыкамі.

У парку Горкага на пляцоўцы побач з Мінскім планетарыем часам ладзяцца вечары тратуарнай астраноміі, калі выстаўляюцца тэлескопы і наведвальнікі парку могуць «набліжаць зоркі». Між іншым, чарговы вечар тратуарнай астраноміі плануецца правесці ў пачатку новага навучальнага года (у верасні ці кастрычніку). Як распавядае **загадчык планетарыя Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі Аляксандр МІКУЛІЧ**, пасля такіх мерапрыемстваў заўсёды застаецца шмат прыемных водгукаў, часам нават і ў вершах. І калі вы зразумелі, што гэта рамантычнае хобі вам даспадобы, далучайцеся.

Пры Мінскім планетарыі ўжо два гады збіраецца клуб аматараў астраноміі «Аш-Ню», у асноўным ён аб'ядноўвае студэнтаў і моладзь, якая ўжо працуе. Найбольш дасведчаныя астраномы-аматары ўзначальваюць розныя секцыі. Самая папулярная — секцыя візуальных назіранняў аб'ектаў космасу. Нават калі ў вас няма прыватнага тэлескопа, можна далучыцца да тых, у каго ён ёсць, і разам назіраць за туманнасцямі, зорнымі скопішчамі, галактыкамі, планетамі і іншымі даступнымі аб'ектамі. Прычым рабіць гэта можна як у Мінску, так і выязджаючы за горад, дзе глыбей можна зазірнуць у космас.

За Сусветам можна не толькі назіраць, але і фатаграфаваць яго, у клубе ёсць адпаведная секцыя — астрафатаграфіі. Дарэчы, цяпер у планетарыі ладзіцца выстава, дзе выстаўляюцца такія здымкі: аматарамі зазнятыя Месяц, серабрыстыя аблокі, міжнародная касмічная станцыя, спадарожнікі.

Адзін з самых цікавых кірункаў аматарскай астраноміі — назіранне за пакрыццямі зорак астэроідамі. Астэроіды могуць засланяць сабой зоркі (падобна на зацьменне Сонца Месяцам). Калі загадзя пралічыць, дзе будзе бачна пакрыцце зоркі, і выехаць у тыя мясціны, можна зрабіць пэўныя адкрыцці (удакладніць арбіту астэроіда, вызначыць яго дыяметр, адкрыць двайную зорку).

КАНЦА СВЕТУ НЕ БУДЗЕ

Апошнім часам у сродках масавай інфармацыі і інтэрнэце мусоліцца інфармацыя пра канец свету, які быццам бы адбудзецца ў 2012 годзе. На некаторых сайтах заведзены гадзіннік, які адлічвае, колькі дзён, гадзін, хвілін засталося людзям да смерці. Нават чуткі пайшлі, што ў Кітаі будуюцца спецыяльныя сховішчы, дзе аўтаномна людзі могуць пратрымацца каля 30 дзён. Хоць навошта ладзіць такія часовыя прыстанкі, калі наступіць канец свету? Цяпер быццам бы ў кірунку Зямлі рухаецца загадкавая планета Х, планета Няміру.

Цікаўлюся ў загадчыка Мінскага планетарыя, ці варта верыць чуткам пра канец свету.

— Людзей, якія ў гэта вераць, я запрашаю на нашы зорныя навіны, тэму апакаліпсісу мы тут таксама абмяркоўвалі, — заўважае Аляксандр Мікуліч. — І з чым толькі гэта ні звязваюць. Але тое, што ў найбліжэйшы час на нас упадзе камета ці астэроід, малаверагодна, папросту немагчыма.

— А ці ёсць жыццё на Марсе? Кажуць, што там знайшлі ўжо мікраарганізмаў.

— Усе задаюць гэтае пытанне. Сапраўды, ёсць тэорыя, што на Марсе жыццё існавала, да гэтага часу яго шукаюць. Найбольшая колькасць спадарожнікаў накіравана на Марс. Пакуль жыцця ніякага не знойдзена, але знойдзена вада ў цвёрдым стане, асабліва яе шмат на палярных шапках Марса. Калі ёсць вада, уяўляецца магчымым і існаванне жыцця. Мікраарганізмаў ці кавалкаў дрэў там не знаходзілі. Гэта навіны на мяжы фантастыкі, калі б штосьці падобнае знайшлі, гэта была б вялікая навіна, быў бы рэзананс у навуковых колах, такія факты пацвярджаліся б шматразова. Але яўных пацвярджэнняў таму не было.

— А праўда, што на Месяцы ёсць горы і моры?

— На Месяцы ёсць горы, моры і нават... балоты. Зразумела, морамі і балотамі яны названыя ўмоўна, бо вады на Месяцы няма, усюды паверхня пакрытая рыгалітам (гэта вынік асядання касмічнага пылу). Там няма вятроў, там вакуум і таму яшчэ і цяпер захаваліся сцежкі, пратаптаныя амерыканскімі астранаўтамі. Хоць некаторыя даследчыкі выстаўляць версію, што амерыканцы не высаджваліся на Месяцы, а відэазапіс зроблены штучна на Зямлі, усё ж астранаўты там былі. Амерыканскі спадарожнік, які робіць дэталёвыя фатаграфіі, сфатаграфаваў усе ўчасткі, дзе яны высаджваліся. Мы і лекцыі на гэту тэму ладзілі.

Прынамсі, Мінскі планетарый — адзінае ў Беларусі месца, дзе можна атрымаць навіны, звязаныя з найноўшымі даследаваннямі і адкрыццямі ў астраноміі. Штопятніцу а 19-й гадзіне тут праходзяць выпускі зорных навінаў для ўсіх ахвотных, і ладзяцца яны сумесна з абсерваторыяй БДУ (уваход вольны). Такія навіны «выходзяць» ужо паўгода, і ў іх склалася пастаянная аўдыторыя. Тут можна атрымаць аб'ектыўную інфармацыю, паўдзельнічаць у яе абмеркаванні, даведацца, якія цікавыя з'явы можна назіраць.

— А як вы ставіцеся да астралогіі?

— Мы займаемся астраноміяй, а да астатняга, накшталт таго, што ад Месяца залежыць выпадзенне валасоў, ставімся скептычна ці з гумарам. Хоць ёсць такія людзі, якія тэлефануюць да нас у планетарый, каб даведацца... калі лепш садзіць агуркі, арыентуюцца па фазах Месяца (між іншым, інфармацыя аб фазах Месяца падаецца на сайце планетарыя).

— А іншапланецяне існуюць?

— Хтосьці з аматараў астраноміі ў гэта верыць, хтосьці не. Ёсць праекты па пошуку сувязі з іншапланетным розумам. У некаторых з іх кожны ахвотны можа паўдзельнічаць, трэба толькі праз інтэрнэт загрузіць на свой камп'ютар праграму, якая будзе апрацоўваць інфармацыю, што трапляе з космасу.

ЗОРКА Ў ПАДАРУНАК

У планетарыі робяцца сеансы, адукацыйныя і пазнавальныя праграмы на розны ўзрост. Знаёміцца з космасам можна пачынаць ужо з малодшага школьнага ўзросту. Самым маленькім пра яго распавядаецца пры дапамозе касмічных казак. Праграмы ў планетарыі ладзяцца для груп (ад 10 чалавек), але сюды можна патрапіць і індывідуальна, адзіная ўмова: загадзя патэлефанаваць. Тут стараюцца распрацаваць і новыя праграмы, напрыклад, да Новага года і да Дня закаханых. Тут можна будзе адзначыць свой дзень нараджэння ці павіншаваць жаніха і нявесту. Вядома ж, ні імяніннікі, ні маладыя тут не атрымаюць у падарунак зоркі (наогул да прыватных арганізацый, якія прадаюць зоркі, астраномы ставяцца негатыўна, бо людзі плацяць за прыгожы сертыфікат, а назва ў навуковым свеце нікім не будзе прынятай). Якія сюрпрызы тут можна падарыць каханаму чалавеку, Аляксандр Мікуліч раскрываць не хацеў (інакш сюрпрызу не атрымаецца), але вядома, што віншаванне можа атрымацца вельмі рамантычным, з экскурсіямі па зорным небе, легендамі, а чаго вартыя «спецэфекты» планетарыя, калі на купале пры дапамозе спецыяльных прыбораў з'яўляюцца камета, касмічны карабель, Месяц. Тут можна пабачыць парад планет, усход і заход сонца, паўночнае ззянне, метэорныя плыні і, безумоўна, зорнае неба ў поўнай цемры. Праўда, зоркі гэтыя не сапраўдныя, але вельмі на іх падобныя. На жаль, доступ да натуральных зорак тут закрыты: абсерваторыя Мінскага планетарыя ўжо 11 гадоў зачыненая для наведвання. Толькі часам аматары з астранамічнага клуба трапляюць туды. «Цяпер адрэстаўраваны галоўны тэлескоп, але сам будынак абсерваторыі ў аварыйным стане. Рэканструкцыя адзінага ў Беларусі публічнага планетарыя і абсерваторыі — балючае пытанне», — заўважае Аляксандр Мікуліч. Хоць апошнім часам з'явілася надзея: ужо ёсць рашэнне аб рэканструкцыі і, хто ведае, можа ў хуткім часе знойдуцца і грошы на гэта. А значыць зоркі стануць бліжэй. І назіраць за далёкімі галактыкамі, туманнасцямі і тымі ж каметамі зможа больш людзей.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Фота БЕЛТА.

Айда ў сеціва?

«Вконтакте» добра, а... тэт-а-тэт лепш

Дзесьці каля 40 працэнтаў грамадзян Беларусі называюць сябе актыўнымі карыстальнікамі інтэрнэту. Абсалютная большасць гэтых карыстальнікаў — моладзь. Найвялікшую папулярнасць здабылі сэрверы навін і паштовыя. Адразу ж за імі ідуць сацыяльныя сеткі. Пра апошнія і пагаворым.

Фота Пятра ФАМІНА.

Сацыяльныя сеткі ўзніклі прыкладна ў той жа час, калі з'явіўся і сам інтэрнэт. Галоўнай іх мэтай з'яўлялася і з'яўляецца аб'яднанне людзей з падобнымі інтарэсамі і дзейнасцю. Але гэтая мэта можа трансфармавацца, як гэта здарылася, напрыклад, з вядомай расійскай сеткай «Одноклассники.ru», якая спецыялізуецца на пошуку старых знаёмых, а менавіта аднакласнікаў. Вядомая ж сетка «Twitter» прапануе адказаць усяго на адно пытанне: «Што вы зараз робіце?». У тую ж секунду, як вы даяце адказ, пра ваш занятак ведаюць усе вашы знаёмыя.

Такія сэрвісы дазваляюць шукаць сяброў, дасылаць ім імгненныя паведамленні, дзяліцца фотаздымкамі і г.д. Фактычна мы маем справу з новым сродкам стасункаў паміж людзьмі, сродкам, які дазваляе быць на сувязі з сябрамі не выходзячы з дому. Вядома, у такім сродку стасункаў можна знайсці як станоўчыя, так і адмоўныя моманты.

Галоўны станоўчы момант — зручнасць такога сродку сувязі. Хочацца вырашыць нейкае пытанне ці проста паразмаўляць — дастаткова толькі напісаць сябру. Калі ён зараз у сеціве, то імгненна адкажа. Калі ж не, то прачытае паведамленне, як толькі пачне карыстацца сайтам. Ці вось, скажам, летам вы недзе адпачывалі. Замест таго, каб раздрукоўваць фота і паказваць іх усім знаёмым паасобку, можна проста закінуць іх у сеціва з тлумачальнымі подпісамі пад кожным экзэмплярам.

Некаторыя сеткі будуць нагадваць нам пра дні народзінаў сяброў, дапамогуць знайсці новых знаёмых ці нават прапануюць паслухаць новую музыку на любы густ. Ёсць сеткі, якія спалучаюць у сабе ўсе вышэйназваныя функцыі. Дарэчы, нават рэклама ў сацыяльных сетках падбіраецца па вашым сацыяльным статусе, узросце і полу: тым большая верагоднасць, што яна вас зацікавіць. Самым распаўсюджаным з такіх сайтаў у Беларусі з'яўляецца расійскі сайт «Вконтакте», на якім зарэгістравана каля 80 мільёнаў карыстальнікаў.

Адмоўным жа момантам згаданага сродку сувязі з'яўляецца неадмежаванасць інфармацыі ад пэўных людзей. Напрыклад, усё таму ж сайту «Вконтакте» было вынесена папярэджанне за тое, што школьнік прачытаў у нейкай суполцы, як можна самому зрабіць выбухоўку, вырашыў паспрабаваць ажыццявіць гэта і ў выніку атрымаў цяжкія траўмы. Акрамя таго, хакеры вельмі любяць узломліваць акаўнты і потым карыстацца асабістай інфармацыяй людзей.

На мой жа погляд, ніякія «адзінкі і нулі», што бягуць па правадах, не змогуць замяніць чалавеку жывой размовы. Ну, а паколькі без сацыяльнай сеткі цяпер усё адно не абысціся, імкніцеся не змяшчаць там інфармацыі, якую могуць упадабаць махляры. А вось ад непатрэбнай інфармацыі кожны здольны адмежаваць сябе сам, без аніякай дапамогі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

Белорусский Банк Малого Бизнеса

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 июля 2010 года

Закрытое акционерное общество «Белорусский Банк Малого Бизнеса»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 июля 2010	на 1 июля 2009
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	3 303,6	878,9
3	Средства в Национальном банке	1102	2	20 935,3	94,9
4	Ценные бумаги:	1103			
	для торговли	11031	3		
	удерживаемые до погашения	11032	3.1		
	в наличии для продажи	11033	3.2		
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	8 991,2	11 147,2
6	Кредиты клиентам	1106	5	77 803,0	14 125,0
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6		
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	2 501,0	584,5
9	Прочие активы	1109	8	2 397,8	731,1
10	ИТОГО активы	110		115 931,9	27 561,6
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9		
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	19 698,0	7 351,6
14	Средства клиентов	1206	11	65 865,8	452,6
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208			
16	Прочие обязательства	1209	12	333,0	412,0
17	ВСЕГО обязательства	120		85 896,8	8 216,2
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	35 637,7	23 700,0
20	Эмиссионный доход	1212			
21	Резервный фонд	1213			
22	Накопленная прибыль	1214	14	-5 614,5	-4 354,6
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	11,9	
24	Всего капитал	121		30 035,1	19 345,4
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		115 931,9	27 561,6
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	257 421,9	30877,4
28	Обязательства	1302	17	32 602,5	545,4

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 01 июля 2010 года

Закрытое акционерное общество «Белорусский Банк Малого Бизнеса»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 июля 2010	на 1 июля 2009
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		6 366,5	1 762,7
2	Процентные расходы	2012		1 649,6	44,1
3	Чистые процентные доходы	201	18	4 716,9	1 718,6
4	Комиссионные доходы	2021		1 777,4	378,7
5	Комиссионные расходы	2022		140,6	167,1
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	1 636,8	211,6
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	-1 122,5	1 035,9
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21		
9	Доход в форме дивидендов	205			
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	413,9	93,6
11	Прочие доходы	207	23	1 007,1	0,8
12	Операционные расходы	208	24	5 882,8	3 233,0
13	Прочие расходы	209	25	356,9	191,7
14	Налог на прибыль	210		70,2	
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		-485,5	-551,4

Председатель Правления **С. Орлески**

Главный бухгалтер **А.Н. Бельник**

Дата подписания 12 июля 2010 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 29 от 22.12.2009 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Открытое акционерное общество «Могилевский завод искусственного волокна» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ

Аукцион состоится 17 августа 2010 года в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Продавец и организатор аукциона: ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, контактный телефон (8 0222) 29 75 13.

№ лота	Наименование объекта	Краткая характеристика	Начальная цена продажи, руб., с НДС	Сумма задатка, руб.
1	Здание склада каустика	Общая площадь 199,3 м², отдельно стоящее, кирпичное, одноэтажное, две рампы, подъезд – авто и железная дорога. Земельный участок с кадастровым номером 740100000003005144 площадью 0,0554 га.	35 000 000	3 500 000
2	Здание склада СУ-57	Общая площадь 373,4 м², кирпичное, отдельно стоящее, одноэтажное, 2 рампы, подъезд – автодорога. Земельный участок с кадастровым номером 740100000003005206 площадью 0,2168 га.	105 000 000	10 500 000
3	Контейнер для стройплощадки	Металлический, габариты 2х6х2,3 м, объем 31,8 куб.м, вес 1980 кг.	4 128 600	412 860

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Земельные участки расположены в водоохранной зоне р. Днепр, в которой устанавливается специальный режим хозяйственной деятельности, которая должна осуществляться с соблюдением мероприятий, предотвращающих загрязнение, засорение и истощение вод.

Заявителю, для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задаток перечисляется не позднее 16 августа 2010 года на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491015 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 202, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.

Последний день подачи заявок: **16 августа 2010 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона состоится 17 августа 2010 года с 13.30 до 14.00 в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет оплаты приобретенного объекта. Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней, после проведения торгов, возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением документации, необходимой для его проведения.

Чырвоная Змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

Нататкі турыста

КРЫМ ВАБІЦЬ

Нягледзячы на пагардлівае стаўленне да крымскага «савецкага» адпачынку аматараў турэцкай сістэмы «ўсё ўключана», паўвостраў на Чорным моры вабіць людзей і развіваецца імклівымі тэмпамі.

Такое ўражанне, што сёлета высокі сезон у Крыме, які прыпадае на канец ліпеня і жнівень, пачаўся раней. Мора цёплае, сонейка ззяе, а таму людзі масава пацягнуліся да крымскіх берагоў у другой палове чэрвеня. Гэта цяпер і эканамічна абгрунтавана: кошты на адпачынак у першай палове лета значна меншыя. А чарэшневы сезон нічым не горшы за персікавы і кавуновы.

Цэны ў параўнанні з мінулым годам не змяніліся. Напрыклад, на заходнім узбярэжжы Крыма ў ліпені можна атрымаць нумар з усімі выгодамі за 13-15 долараў з чалавека. У жніўні кошты падымуцца да 20 долараў і вышэй. І пры гэтым на папулярных базах адпачынку ўжо нестае вольных месцаў.

Прыватныя міні-гатэлі, вялікія базы адпачынку і санаторыі перабудоўваюцца і добраўпарадкоўваюцца. На месцы тых самых савецкіх домікаў з выгодамі на двары і сціплых катэджаў часоў позняй перабудовы будуюцца шматпавярховыя дамы са стандартнымі нумарамі, дзе ўлічаны ўсе патрабаванні сучаснага турыста. Будаўніцтва на ўзбярэжжы ідзе імкліва: падаецца, яшчэ некалькі дзён таму тут корпаліся рабочыя, а сёння ўжо пад развешанымі купальнікамі і ручнікамі ядуць дыню турысты.

Самыя дбайныя гаспадары на ўзбярэжжы ўлічваюць, што чалавеку, які адпачывае, патрэбны не толькі жытло і мора, а таксама і зялёная прастора навокал. Таму радуюць вока зялёныя сады і мураваныя кампазіцыі, вакол якіх звычайна ўзнікае фатаграфічны ажыятаж.

Крымскае ўзбярэжжа расце ўверх яшчэ і з прычыны дарагавізны зямлі. Прычым з-за вольных участкаў разварочваюцца сапраўдныя баталіі. Напрыклад, на пачатку ліпеня ў Сакскім раёне адбылася трагедыя, якая прымусіла мясцовыя газеты напісаць на вяртанне ліхіх 90-х. Старшыня пасялковага савета прыбярэжнага пасёлка Новафёдараўка быў расстраляны ва ўпор, калі раніцай садзіўся ў свой аўтамабіль, каб ехаць на працу. Аўтаматчыка-матацыкліста так і не знайшлі. Курортная Новафёдараўка, якая была некалькі дзясяткаў гадоў таму ваенным гарадком каля Сакаў, апошнім часам актыўна развівалася. Прычым інтарэс да гэтага месца выяўлялі не толькі прадпрымальнікі, якія будавалі пад выглядам лецішчаў міні-гатэлі, але і буйныя кампаніі, якія пачалі будаўніцтва грандыёзных турыстычных аб'ектаў. Відаць, нечыя інтарэсы супярэчылі ўладзе... Праўда, гэтае забойства, гавораць у Саках, наўрад ці затармозіць будаўніцтва ў Новафёдараўцы. Сезон ідзе, турыст ёсць, будуць і прыбыткі.

Сфера гандлю ў Крыме даўно не абмяжоўваецца некалькімі сціплымі шапікамі на турбазе. Для разнастайных крамаў будуюць адмысловыя «вуліцы буцікаў», кавярні змагаюцца за кліентаў адметнымі меню, зніжкі прапаноўваюць шматлікія арганізатары экскурсій.

Цэны на харчы сёлета засталіся леташнімі. Харчавацца можна чым хочаш: ад капеечных слоеных булак да шыкоўных страў з морапрадуктаў у зялёных інтэр'ерах. Прадаўцы і афіцыянты працуюць ветліва, і асабліве ўражанне робяць на не вельмі спешчаных у сферы гандлю беларусаў татары. Не, яны не зніжаюць цэны, але запамінаюць усіх пастаянных пакупнікоў і абслугоўваюць іх з вялікай усходняй павагай.

Пры ўсім развіцці сеткі кавярняў і рэстарацый на пляжы па-ранейшаму носяць «маладую, гарачую кукурузу» і разнастайныя булкі. Сярэдні кошт — 10 грывень, крыху болей за долар. Цяпер 1 долар каштуе прыкладна 7,9 грыўні.

Выгоды крымскага адпачынку дазваляюць цяпер бязбоязна прыязджаць нават з самымі малымі дзецьмі. Таму сёлета тут адчувальна болей стала маці з немаўлятамі: здаецца часам, што толькі нарадзіла і ўжо расслаблена сядзіць пад навесам на пляжы.

На базах адпачынку платная медыцынская дапамога забяспечана (у адной з іх кансультацыя каштуе ад 30 да 50 грывень), аптэкі на беразе мора працуюць кругласутачна (і цэны ў іх нярэдка ніжэйшыя за беларускія), а дзіцячыя малочныя кашы ёсць у меню нават крымскіх цётачак, якія абслугоўваюць турыстаў варэнікамі ды баршчамі ўласнай вытворчасці.

Народ едзе ў Крым таксама і па лячэнне. Напрыклад, вялікай папулярнасцю карыстаюцца знакамітыя гразі з сакскіх азёраў. Можна, вядома, лячыцца самастойна: вольна плаваць у возеры, дзе салёная вада не дае патануць і «цвёрда» трымае любога купальшчыка на паверхні, а потым бясплатна мазацца чорнай граззю. А можна патрапіць і ў любы санаторый, дзе ёсць грязелячэбніца: курсоўка каштуе не так і дорага, за 10 сеансаў — ад 350 грывень, ці 45 долараў.

І нарэшце пра надвор'е. Упершыню за многія гады ў Крыме можна было пабачыць не толькі кароткія моцныя ліўні, але і працяглыя і не вельмі цёплыя дажджы. Самі крымчане ў сувязі з такім надвор'ем чамусьці ўзгадвалі смерць Вангі, пасля чаго на чарнаморскім узбярэжжы 40 дзён было дажджлівае надвор'е, нібыта на знак смутку па вядомай празорліўцы.

Кліматолагі ў тэлевізіі казалі іншае: усё звязана з глабальным пацяпленнем, зменай клімату. Таму і робіць надвор'е ў Крыму такія сюрпрызы — не вельмі прыемныя для турыстаў, якія прыязджаюць на кароткі адпачынак. Астатнія не вельмі засмучаюцца: гаворыць, што дождж тут таксама крымскі і карысны і што чыстым марскім паветрам можна дыхаць пры любым надвор'і. А неўзабаве з'яўляецца сонейка, і людзі радасна бягуць на пляж, у крымскую хвалю.

Алена КАЗЛОВА.

Архітэктар-рэстаўратар Уладзімір ПАПРУГА:

«НІЧОГА НЕ РАЗБУРАЮЧЫ, ДАБІВАЦЦА ГАРМОНІІ»

УДРУГОЙ частцы гутаркі легендарны архітэктар-рэстаўратар Уладзімір ПАПРУГА апавёў «Звяздзе», як вырашыць транспартную і горадабудаўнічую праблемы Мінска, а таксама як яму працуецца галоўным архітэктарам беларускага праекта ў Венесуэле і чаму за два гады ён ні разу не схадзіў там у кабак.

«Гэтая савецкая байка, што Мінск быў занядбаны брудны горад з павалеными платамі»

— І якая ваша прапанова па вырашэнні горадабудаўнічай і транспартнай праблемы ў Мінску?

— Я склаў архітэктурны праект вырашэння горадабудаўнічай і транспартнай праблемы Мінска на 90 старонках. Мая прапанова — развесці ўсе гістарычныя кірункі і выезды з горада такім чынам, каб сучасны горад ніяк не канфліктаваў з горадам гістарычным. Бо ў нас атрымалася так, што гістарычны цэнтр пастаянна канфліктаваў з Мінскам-савецкім. Мінск-гістарычны і Мінск-савецкі мусяць гарманічна дапаўняць адзін аднаго. Мы павінны спакойна з Серабранкі ці Шабаноў па магістралі агульнагарадскога значэння заехаць у гістарычны цэнтр — але толькі на ягоную ўскраіну. Прыпаркавацца — і спакойненька прайсці ў тое месца, якое нас цікавіць. Былі прапанаваныя тры ўмоўныя кірункі — Усходняя брама, Паўночная брама і Заходняя брама, дзе ствараюцца парковачныя цэнтры. Мы там паркуемся — і ў нармаваных радыусах пешаходнай дасягальнасці (400—500 метраў) спакойна даходзім да патрэбнага пункта. Такім чынам мы вырашаем і праблему паркоўкі, і праблему рэгенерацыі гістарычнага цэнтра. Што адбываецца цяпер? Па ўсіх сённяшніх нарматыўных дакументах ніводзін інвестар не можа ў прынцыпе нешта запраектаваць і збудаваць без забеспячэння паркоўкі. А калі горадабудаўнічая праблема не вырашана, як у нас, то кожны інвестар павінен на тым лапіку зямлі, што яму выдалі, забяспечыць парковачныя месцы. Як гэта мажліва? Ніяк. Дакладней, толькі адным чынам: знесці гісторыка-культурную каштоўнасць, зрабіць падземны паркінг — а наверсе паставіць тое, што архітэктару вяроўкіну «стукне ў лоб». Таму і знікаюць у нас адзін за другім старадаўнія помнікі архітэктуры. Бо забудова горада ідзе не сістэмна, а хаатычна — кожны вырашае свае канкрэтныя праблемы і патрэбы.

А мы тым часам губляем гістарычны цэнтр як аб'ект. Я прапаную пачаць вырашаць гэтую праблему — і з гэтага сімбіёзу савецкага Горада Сонца і гістарычнага Менска зрабіць турыстычны брэнд у гістарычным маштабе. Савецкая байка, што тут быў занядбаны брудны горад з павалеными платамі — поўная фальсіфікацыя. Горад Менск — ён старэйшы за Варшаву, за Берлін, за Вільню, за Талін, за Рыгу, за Вену, за Маскву... Фантастыш! Але мы прыязджаем у Мінск — і нічога гэтага не бачым! Што здарылася?! І сёння ствараецца сітуацыя, што калі мы падключым дзяржаўны рэсурс, зробім гэта дзяржаўнай праграмай — гэта можа стаць самым лепшым турыстычным брэндам у прынцыпе ў Еўропе! Што цікава заходнікам? Пабачыць савецкую аўтэнтыку. Гэта наша бяда — але яна зрабілася нашым брэндам! Наш праспект — гэта Горад Сонца, гэта суперпомнік, якога няма нідзе ў свеце! І вось ідзе гэты праспект — а вось гістарычны цэнтр тысячагадовага горада, які старэйшы за многія сталіцы Еўропы! Мой праект таксама ўтрымлівае вырашэнне транспартнай праблемы — і яшчэ ніхто ў Камітэце архітэктуры не сказаў мне, што гэта не падзейнічае.

«Мы прапануем не 15 тысяч квадратных метраў, як цяпер, а 250 тысяч!»

— А якім чынам гэта можна зрабіць тэхнічна ў гатовай гарадской сітуацыі?

— Нічога не знішчаючы, трэба проста звесці ўсё ў адну схему, у адну сетку, забяспечваем транзіт праз горад. Трэба зрабіць толькі «касметычныя» ўдакладненні — літаральна 5-7 % ад таго, што ўжо зроблена.

— Спадар Уладзімір, а вы давялі свой праект да гарадскіх уладаў?

— Улады горада азнаёмленыя з гэтым яшчэ 5 гадоў таму. Іншая рэч, каб навесці парадак у гэтым пытанні, трэба як мінімум задумацца: што цяпер адбываецца ў гістарычным цэнтры? Таму што лабіраванне кожных канкрэтных драбнюткіх аб'ектаў аказваецца перашкодай у рэалізацыі праграмы, якая вырашае многія праблемы навырост.

— Вярнуўшыся з працы на гістарычным палацы ў польскай Пазнані, вы занялі ў Мінску высокую пасаду ў Мінгарвыканкаме. Чаму праблема не пачала вырашацца?

— Так, мне было прапанавана заняць пасаду галоўнага дзяржаўнага інспектара па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Спадчына на той час сістэмна нішчылася, як нішчыцца, лічу, і сёння. І маёй задачай было спакойна ўвайсці ў сістэму, паспрабаваць пазітыўна і бесканфліктна на ўзроўні планавай палітыкі Мінгарвыканкама развесці нейкія праблемы. У гэтым сэнсе ўсё, што можна было зрабіць, было зроблена. Гэтыя гады былі для мяне вельмі важныя, бо калі я прыехаў у Мінск, у мяне паняцця зялёнага не было, як вырашыць праблему горада. Я глядзеў па тэлевізары, як нядаўна прэзідэнт прызначаў новага кіраўніка Мінска Ладуцьку. І ўсё, што Аляксандр Рыгоравіч там казаў — кладзецца вось у гэтую маю схему, усе гэтыя праблемы можна вырашыць, найперш транспартны калапс. Мінск не мае дынамікі сучаснай еўрапейскай сталіцы. Па дынаміцы мы жывём недзе ў 1970-х гадах. А што будзе заўтра, калі ў Мінск напраўду прыйдуць інвестыцыі?.. Наша задача — каб кожная капеечка, якая сюды ўпадзе, патрапіла на адпаведнае месца. Каб не трэба было пасля гэтыя капеечкі выкалупваць, бо няма канцэпцыі развіцця горада.

Той самы падмурак, куды закладалі сімвалічныя шуфлі бетону прэзідэнты Чавес і Лукашэнка падчас візіту беларускага Прэзідэнта.

— Як вы лічыце, чаму ў нас часам знішчаюцца помнікі архітэктуры? Ёсць жа Закон, які забараняе гэта рабіць, ёсць Упраўленне па ахове спадчыны. Чаму мы чуем «зводкі з франтоў»: адзін будынак грохнулі, другі...

— Праблема ў тым, што ўсё гэта робіцца бессістэмна. Сённяшнія інвестыцыі, якія ідуць — яны неэфектыўныя. Што трэба інвестару? Нашы апаненты кажуць: ну добра, вы там нешта запраектавалі — але інвестарам гэта нявыгадна. Поўная лухта! У тым рэжыме, у якім цяпер развіваецца гістарычны цэнтр, патэнцыял — ну 5000, ну 10 000, ну 15 000 квадратных метраў нейкіх там умоўных плошчаў. Прычым умоўных плошчаў, якія ўваходзяць у канфлікт з гістарычным цэнтрам, з методыкай, з законам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Што прапануем мы? У нас патэнцыял гістарычнага цэнтра — гэта 250 тысяч квадратных метраў навукова абгрунтаваных інвестыцый! Дзе на эксклюзіўнай тэрыторыі робяцца эксклюзіўныя аб'екты, якія становяцца тварам цэлай краіны, брэндам, помнікам. Любая інвестыцыя, гэта, перш за ўсё, пазітыўная праграма. Прыходзяць кітайцы, якія гатовыя даць 15 мільярдаў долараў. Пытанне: пад што?

— Былі б грошы, а куды падзець — знойдем!

— Не знойдзем! Ёсць дзяржаўная праграма, якая зможа «перамалоць» гэтыя 15 мільярдаў? Няма! Разумееце, усе гэтыя капіталісты з мяшкамі грошай — гэта бізнэсоўцы, якія добра ведаюць, што грошы павінны круціцца. І праект, які мы прапануем, — бяздонны! Ёсць месца для свайго «манхэтана». Прычым не недзе там у аэрапорце, а там, дзе цяпер завод каля вуліцы Пулі-хава — практычна ў самым цэнтры! Ён усё адно будзе адтуль выводзіцца — ёсць адпаведнае рашэнне. Нават казалі, што гэтую тэрыторыю ўжо некаму аддалі. Але калі аддалі вось так бессістэмна, як робіцца цяпер, будзе тая самая сітуацыя, што і з іншымі аб'ектамі — будзем пасля думаць, што з гэтым рабіць, як вырашыць праблему транспарту. Наша прапанова прадугледжвае і такі «манхэтан», і захаванне гістарычнага цэнтра, і захаванне Мінска-савецкага... Такая схема развіцця будзе запатрабаваная і праз 200 гадоў. І калі гэта будзе сістэмная інвестыцыя — усе кінуцца да нас. Аднак гэта будзе не толькі інвестыцыяй, не толькі знешнетурыстычным брэндам, але і ўнутраным. Куды вязуць усіх школьнікаў, якія цяпер падрастаюць? На Курган Славы і ў Хатынь? Гэта выдатныя помнікі савецкага часу. А дзе ж ідэалагічная праграма Дзяржавы Беларусь? А вось яна! Вось гістарычны цэнтр, тысяча гадоў нашай гісторыі. А вось савецкая спадчына. А вось дасавецкая спадчына. Праграма навырост!

Замест нашых буслоў у Маракаі сядзяць на дрэвах вось такія птушкі.

— Вы занялі пасаду ў Мінгарвыканкаме з такімі светлымі думамі! І што, удалося нешта зрабіць?

— Калі я заняў гэтую пасаду, проста не было гэтай канцэпцыі, ідэі. Бо не было матэрыялаў, не было даследаванняў. Ідэі, якая бесканфліктна развяла б Мінск-савецкі з Мінскам-гістарычным, не было ніколі. Яна з'явілася ў мяне ў час працы 2002—2007 гадоў. Мы, злучыўшы хаатычныя вуліцы, стварылі дублёр праспекта Незалежнасці — аўтамагістраль гарадскога значэння без скрыжаванняў і святлафораў, па якой можна будзе праехаць ад аэрапорта да Нацыянальнай бібліятэкі нон-стоп! Такім жа чынам, падобнай магістраллю, вырашана праблема поўнач-поўдзень.

— Спадар Уладзімір, дык чаму, калі ваш праект такі добры, за яго не ўхапіліся гарадскія ўлады?

— Гэта пытанне да іх. Я зрабіў што мог: архітэктурны праект быў гатовы ў 2007 годзе. Тады ж ён быў урачыста і бясплатна перададзены ў Мінгарвыканкам як падарунак Таварыства аховы помнікаў. Перад тым нават адбылася нарада ў Адміністрацыі Прэзідэнта, на якой быў прадстаўлены праект. Усё было ўхвалена, прызначаная дата наступнага пасяджэння. І ўсё, цішыня.

— Чаму вы пайшлі з дзяржаўнай працы?

— У мяне сканчаўся кантракт. Я разважыў, што не змагу спыніць будаўніцтва ўсіх гэтых вусцішных паркінгаў на Нямізе. Калі б я застаўся, і ўсё гэта адбывалася пры мне, гэта азначала б, што я з гэтым згодны. Таму калі мяне выклікаў начальнік аддзела культуры і сказаў: «Уладзімір Адамавіч, мы не зможам з вамі працягнуць кантракт», я згадзіўся, але адмовіўся пісаць заяву па ўласным жаданні. Калі я дрэнны работнік — звальняйце. Яны палохалі мяне «дрэннымі запісамі ў працоўнай кніжцы», аднак я не паддаўся.

«Мы будуем у Венесуэле цэлы горад, на 10 тысяч жыхароў»

— Як вы патрапілі ў Венесуэлу?

— На кароткі час я вярнуўся ў Польшчу, пасля ўзнік гэты венесуэльскі праект. Мне было цікава заняцца гэтым, я хацеў пабачыць Паўднёвую Амерыку. Таму я і пайшоў зноў на дзяржаўную службу: рэалізацыю міждзяржаўнага пагадненння між Урадам і Міністэрствам архітэктуры Беларусі і венесуэльскім Міністэрствам жылля і навакольнага асяроддзя. У нас ёсць кантракт на будаўніцтва 5000 кватэраў — гэта першая чарга. Праект ідзе ў горадзе Маракай.

— Як там правільна завецца ваша пасада?

— Я начальнік майстэрні па праектаванні і галоўны архітэктар гэтага венесуэльскага праекта.

— Дык гэта будзе новы раён у горадзе?

— Гэта будзе фактычна цэлы горад. Наша пляцоўка — 30 тысяч гектараў — разлічана на 10 365 чалавек. Я запраектаваў раён у поўнай адпаведнасці з венесуэльскай нарматыўна-прававой базай: нормы па гандлёвых, адукацыйных аб'ектах, зонах адпачынку...

— А рукі, матэрыялы — там усё наша?

— У адпаведнасці з кантрактам, мы можам прыцягнуць туды не больш за 10 працэнтаў нашага персаналу. Цяпер у нас чалавек 50-60 беларускага кантынгенту — збольшага прарабы і праектная група. Астатнія венесуэльцы.

— А на якой мове вы з імі гаворыце?

— Працоўная мова ў нас іспанская, дакументацыя венесуэльскім міністэрствам зацвярджаецца па-іспанску.

— Вам давялося для гэтага вывучыць мову?

— У прынцыпе так. Аднак, разумееце, праектная дакументацыя — гэта як хімічная формула, інтэрнацыянальная рэч.

— Маракай — гэта ж не сталіца Венесуэлы, чаму праект рэалізуецца менавіта там?

— Я думаю таму, што камандантэ Чавес асабіста заангажаваны гэтым праектам — ягоная палітычная кар'ера пачалася з Маракая. Ён быў камандзірам дэсантнай базы, якая знаходзіцца непадалёк ад нашага аб'екта. Ён добра ведае гэтае месца — мяркую, ён яго асабіста і прапанаваў. Маракай размешчаны вельмі добра, удала звязаны са сталіцай Каракасам. Адтуль да Карыбскага мора па прамой праз горы 15 кіламетраў, па спідометры — 45.

— Пасля праекта па родным Мінску, маракайскі, відаць, не настолькі вам ментальна блізкі?..

— Той досвед, які я набыў у час стварэння праекта па Мінску, дапамог мне і ў Маракаі. Тое праграмнае забеспячэнне для камп'ютара, якое я выкарыстаў на мінскім праекце — у Маракаі ніхто яшчэ не ўмее на гэтым працаваць. У мяне там няма канкурэнцыі. Я стараюся рабіць добра і навырост.

— Але атрымліваецца, што ваш праект па Мінску стаўся проста забытым?

— Я абсалютна ўпэўнены, што ён усё адно будзе запатрабаваны. Гэта не залежыць ні ад мяне, ні ад Мінгарвыканкама. Ёсць аб'ектыўныя рэчы, якія адбываюцца ў развіцці тысячагадовага горада. Іншая праблема, што сёння вырашыць гэтыя задачы ім будзе каштаваць рубель, а заўтра — паўтара рубля. Калі страцім яшчэ 10 гадоў — гэта будзе каштаваць 10 рублёў, а рабіць усё адно давядзецца.

«Беларусь і Венесуэла вельмі падобныя»

— Большасць беларусаў ніколі не былі ў Венесуэле, не кожны дакладна нават скажа, дзе яна знаходзіцца. Што гэта за краіна, якая раптоўна сталася нам настолькі блізкай, што мы нават рэалізоўваем там такі буйны будаўнічы праект? Вы там ужо два гады, дык распавядзіце.

— Гэта тлумачыцца лёгка: у нас з Венесуэлай няма ніякіх культуралагічных і гістарычных праблемаў. У гэтым сэнсе сябраваць на адлегласці, праз межы значна прасцей, чым быць суседзямі. Венесуэла — вельмі пазітыўная краіна з цудоўным кліматам. Самая галоўная праблема там — каланіяльны досвед. Венесуэла мае вельмі цяжкі досвед, але яна дынамічная. Сённяшняе насельніцтва Венесуэлы — гэта якраз тыя акупанты, якія прыйшлі сюды 500 гадоў таму. Але, як ні дзіўна, гэтыя людзі, разбурыўшы гэтую культуру, не стварылі, лічу, за 500 гадоў нічога свайго: няма ні тэатра, ні літаратуры, ні архітэктуры, ні кіно... У нас кожны лужок і кожны барок маюць свае назвы і імёны. А ў іх — «дарога», «лес», «рака».

— Ці праўда, што там даволі небяспечная крымінагенная сітуацыя?

— На 30-40 % тэрыторыі Каракаса ніколі ў жыцці не ўваходзіла паліцыя. Людзі жывуць у трушчобах ледзь не племянным ладам на гэтых гарах, там сваё самакіраванне, свае разборкі...

— Быў выпадак, калі там забілі беларускага перакладчыка...

— Сярод белага дня! Чалавек ехаў на працу, стаяў на прыпынку, кругом было шмат людзей. Яму прыставілі пісталет да галавы, ён не захацеў аддаць ноўтбук — яго застрэлілі і ўцяклі. І іх, здаецца, ніхто нават не шукае.

— Вам там не страшна жыць?

— Я стараюся нікуды не выходзіць апроч дома і працы. Але там праўда жыцця такая, што можна пайсці ў краму па малачко — і не вярнуцца. Усе гэтыя хлопцы катаюцца нават не з нажамі, з пісталетамі!.. Я жыву ў 15-павярховым доме, на 10-м паверсе. Абсалютна на ўсіх вокнах дома стаяць краты. Дом абнесены трохметровым бетонным плотам, над ім — скруткі калючага дроту, да якога падведзены ток. Каб увайсці на тэрыторыю — электронная таблетка. Каб увайсці ў пад'езд — электронная таблетка, на ўваходзе ў ліфт — таксама, на паверх — тое самае. Кругласуткава дзяжурыць узброеная аўтаматамі ахова. Уся Венесуэла так жыве. Калі ў Беларусі можна прызначыць дзяўчыне спатканне, прагуляцца пад Месяцам па вуліцах горада, паслухаць птушак, то ў Венесуэле такое выключана.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота з прыватнага архіва Уладзіміра ПАПРУГІ.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Уладзімір ПАПРУГА — вядомы архітэктар-рэстаўратар. Нарадзіўся ў Мінску, вучыўся ў Мінску, Рыме і Венецыі. Працаваў у Польшчы, затым — на пасадзе галоўнага дзяржаўнага інспектара па ахове спадчыны Мінгарвыканкама. Ужо два гады працуе галоўным архітэктарам будаўнічага беларускага праекта ў Венесуэле.

НА СЕСІЮ — З ПРАЙСАМ

Атрымала працяг гісторыя, пра якую мы пісалі ў паведамленні «Здаць экзамен — лёгка!». Выкладчыца Гомельскага дзяржаўнага дарожна-будаўнічага каледжа атрымлівала грошы за здачу экзаменаў. Цяпер высветлілася, што жанчына арганізавала і атрымлівала свой дадатковы заробак разам з мужам — выкладчыкам той жа адукацыйнай установы яшчэ з 2003 года. На гэты момант супрацоўнікам упраўлення КДБ па Гомельскай вобласці дакладна вядома аб больш чым 160 эпізодах атрымання хабару.

Сужэнцам прад'яўлена абвінавачанне ў атрыманні незаконных грашовых узнагароджванняў, здзейсненых паўторна групай асобаў па папярэдняй змове. Муж і жонка выкладалі на розных курсах і розныя вучэбныя дысцыпліны. Спачатку, згодна з праграмай, навучэнцы траплялі да жанчыны, якая растлумачвала, колькі што каштуе. На наступным курсе падлеткі сустракаліся з яе мужам і працягвалі праз яе плаціць за яго дысцыпліны. У затрыманай выкладчыцы канфіскаваныя сшыткі, дзе яна вяла падрабязны ўлік даходаў. Адукацыйныя «паслугі» каштавалі па-рознаму: ад 30 да 200 тысяч у беларускіх рублях. Калі ўлічыць, што выкладчыкі «ацэньвалі» некалькі прадметаў, навучэнцу гэта абыходзілася ў 120-170 тысяч рублёў за сесію. Як расказалі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці, плацілі карыслівым выкладчыкам не толькі «бюджэтнікі», але і «платнікі». У шэрагу выпадкаў няпоўнагадовыя, якія не мелі сваіх крыніц даходаў, на працягу семестра назапашвалі да сесіі грошы, атрыманыя ад бацькоў на кішэнныя расходы. Асабліва неплацежаздольным выкладчыкі давалі магчымасць «здаць» экзамен... у доўг. Следства працягваецца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Наименование банка:

Закрытое акционерное общество «Дельта Банк»

220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95, тел. 279 02 79
www.deltabank.by

ДЕЛЬТА БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 июля 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	9 705,2	4 502,8
3	Средства в Национальном банке	1102	30 549,6	2 302,8
4	Ценные бумаги:	1103	-	-
	для торговли	11031	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	-	-
	в наличии для продажи	11033	-	-
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	79 861,7	48 452,2
6	Кредиты клиентам	1106	97 650,3	61 965,3
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	703,4	703,4
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	9 204,1	9 855,6
9	Прочие активы	1109	6 270,7	5 292,6
10	ИТОГО активы	110	233 945,0	133 074,7
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	0,1	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	56 202,1	28 577,8
14	Средства клиентов	1206	103 701,1	37 154,1
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	1 580,3	160,6
16	Прочие обязательства	1209	1 187,5	1 692,1
17	ВСЕГО обязательства	120	162 671,1	67 584,6
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	72 200,0	64 000,0
20	Эмиссионный доход	1212	-	-
21	Резервный фонд	1213	739,6	513,8
22	Накопленная прибыль	1214	(-2042,5)	815,5
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	376,8	160,8
24	ВСЕГО капитал	121	71 273,9	65 490,1
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	233 945,0	133 074,7
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	75 367,5	55 879,8
28	Обязательства	1302	75 726,8	49 391,8

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 01 июля 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	7 648,8	5 577,9
2	Процентные расходы	2012	7 533,5	2 112,8
3	Чистые процентные доходы	201	**115,3**	**3 465,1**
4	Комиссионные доходы	2021	17 361,8	13 836,5
5	Комиссионные расходы	2022	327,0	209,1
6	Чистые комиссионные доходы	202	**17 034,8**	**13 627,4**
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	(-2494,8)	(-435,3)
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Доход в форме дивидендов	205	-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	2 165,1	715,0
11	Прочие доходы	207	4 146,8	4 340,3
12	Операционные расходы	208	15 809,7	17 364,3
13	Прочие расходы	209	2 869,8	1 815,5
14	Налог на прибыль	210	-	287,2
15	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	2	**(-2042,5)**	**815,5**

И.о. Председателя Правления **А.В. Бабицкая**
И.о. главного бухгалтера **С.С. Запольская**
Дата подписания «12» июля 2010 г.

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

Лот № 1 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. № 420/С-28418, инв. № 420/С-28419, инв. № 420/С-28420, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка площадью 1,3270 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 249 827 438 руб., сумма задатка – 24 982 000 руб.
Лот № 2 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальные строения инв. № 420/С-30936, инв. № 420/С-30937, инв. № 420/С-30938, инв. № 420/С-30939, инв. № 420/С-30337, инв. № 420/С-30338, инв. № 420/С-30340, расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, 51, здание хранилища техники южнее г. Лиды, военный городок № 2 «Южный», и право заключения договора аренды земельного участка площадью 1,4618 га сроком на 50 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 272 729 156 руб., сумма задатка – 27 272 000 руб.
Продавец недвижимого имущества **по лотам 1, 2:** Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», контактный телефон (8 0163) 41 25 92	
Лот № 3 Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Капитальное строение инв. № 450/С-1714, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Гнидаша, д. 3, и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,1339 га сроком на 10 лет
	Начальная цена предмета аукциона – 208 335 080 руб., сумма задатка – 20 833 000 руб.
	Продавец недвижимого имущества: Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактный телефон: (8 0152) 41 78 96
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.grodno.by, www.gki.gov.by	

1. Аукцион состоится **26 июля 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона **по 22 июля 2010 года до 13.00**, кабинет 6.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

3. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить фактические затраты на организацию и проведение аукциона согласно утвержденным сметам, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

4. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

5. **Подробная информация** – в извещении о проведении аукциона, ранее опубликованном в газете «Звязда» **8 июня 2010 г. № 109 (26717).**

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 13 августа 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования, условия продажи	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	Микрорайон жилой застройки «Спутник»	0,0294	50 лет	Строительство и обслуживание магазина товаров повседневного спроса № 52а по генплану	740100000001005638	1 711 020	19 981 000	1 798 000
№ 2	Улица Терехина в районе жилого дома № 9 по генплану микрорайона жилой застройки «Фатина» (ограничения – р. Днепр)	0,0400	50 лет	Строительство и обслуживание магазина по реализации колбасных изделий и мясных полуфабрикатов собственного производства, с условием организации подъезда к магазину со стороны ул.Терехина	740100000006002552	604 433	20 279 000	1 825 000
№ 3	Проспект Мира в р-не набережной р. Дубровенка (ограничения – р. Дубровенка, ЛЭП, водопровод)	0,0161	1 год	Установка и обслуживание кафе-павильона (№ 2) с площадкой для выносной торговли	740100000004003250	1 411 271	1 989 000	179 000
№ 4	Бульвар Непокоренных в р-не жилых домов №№ 8,10 (ограничения – р. Днепр)	0,0032	1 год	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000005004141	552 776	332 000	30 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельные участки расположены на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации; земельные участки для строительства новых объектов – в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа павильона с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона,** в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 7 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 9.08.2010 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 17 августа 2010 года проводит 12-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/наработка в м/ч (износ %)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
95.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18 партия – 60 шт. 3 кат.	н.п. Бобровичи, в/часть 01264	1989	–	25 800 000	2 580 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **17 августа 2010 года.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **13 августа 2010 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **17 августа 2010 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС.**

Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.

ЗВЯЗДА 14 ліпеня 2010 г.

Ідзе нарыхтоўка кармоў у СВК «Кашэвічы».

СВЕТЛЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ,

або Сёння і заўтра Петрыкаўскага раёна ў ажыццяўленні Дзяржаўнай праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся

Драўляная Свята-Успенская царква ў в. Кашэвічы пабудавана без адзінага цвіка.



Старшыня райвыканкама Аляксандр ПІНЧУК.

ЗЯМЛЯ, АВЕЯНАЯ СЛАВАЙ

«Спакойна і павольна, як у зачараваным сне, утуліўшыся ў балоты, нясе Прыпяць сухадоламу Дняпру сваю багатую даніну. Не спяшаецца яна выносіць дабро палескіх балот. А яго так многа, што ўсё роўна, спяшайся не спяшайся, а гэтай работы хопіць на доўгія гады...»

Хто не ведае гэтыя пранікнёныя радкі рамана «Дрыгва» народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа? Хто не захапляўся мужнасцю і адданасцю роднай зямлі легендарнага дзеда Талаша, асоба якога нібы ўвасабляе ўмудраных жыццём жыхароў не толькі беларускага Палесся, а ўсёй нашай краіны? Ветры гісторыі праносіліся над імі, выпрабоўваючы людзей на трываласць, час ад часу прыносячы ім трывогі і беды, адорваючы поспехамі і радасцямі.

Зямля беларуская, у тым ліку і Петрыкаўшчына, за многія стагоддзі зведала дзясяткі войнаў, якія суправаджаліся страшэннымі разбурэннямі, але кожны раз яна адраджалася, залечваючы раны, рушыла наперад і станавілася яшчэ больш моцнай і прыгожай. Гэта сапраўды самабытны край з велічнай і паўнаводнай Прыпяццю, мноствам азёрын, старыц, рэк і рачулак, звонкімі меднаствольмі барамі і, вядома ж, сціплымі і старанными працаўнікамі, якія і цяпер, па даўняй звычцы, называюць сябе палешукамі.

Пра ўсё гэта і многае іншае наша гутарка са старшынёй Петрыкаўскага раённага выканаўчага камітэта Аляксандрам Васільевічам Пінчуком.

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

З мясцовых — карэнны паляшук. Нарадзіўся ў 1972 годзе ў вёсцы Чалюшчавічы Петрыкаўскага раёна, дзе закончыў сярэднюю школу. Вучобу працягнуў у Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, дзе атрымаў вышэйшую адукацыю. Некалькі гадоў назад закончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Пасля вучобы ў політэхнічнай акадэміі вярнуўся ў свой родны раён і ў саўгасе «Чалюшчавічы» стаў працаваць загадчыкам майстэрняў, а неўзабаве, так бы мовіць, пайшоў на павышэнне: быў прызначаны спачатку галоўным інжынерам гаспадаркі, затым адкрытага акцыянернага таварыства «Агратэхсэрвіс», намеснікам дырэктара саўгаса «Чалюшчавічы», галоўным інжынерам ААТ «Петрыкаўскі райаграпрамснаб».

У наступныя гады кар'ерны рост Аляксандра Васільевіча працягваўся: дырэктар камунальнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Веткацепласетка», намеснік старшыні райвыканкама Веткаўскага і Светлагорскага раёнаў. У 2008—2010 гадах — намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы Гомельскага аблвыканкама. У сёлетнім лютым прызначаны кіраўніком Петрыкаўскага райвыканкама.

ПЛАНЫ І РЭАЛІІ

— Аляксандр Васільевіч, ёсць такі народны выраз: дзе нарадзіўся, там і прыгадзіўся. Ён, як нам здаецца, непасрэдна датычыцца і вас. З якімі пачуццямі вярнуліся вы ў родныя краі пасля расставання з імі? Працуючы ў іншых месцах, ці даводзілася вам як службовай асобе ўнікаць у сутнасць клопатаў і праблем Петрыкаўшчыны?

— Свой родны край люблю з дзяцінства, і малая радзіма заўсёды была, ёсць і будзе ў маім сэрцы. Пра славутага дзеда Талаша чытаў яшчэ да вывучэння рамана класіка беларускай літаратуры па школьнай праграме, а пасля яшчэ некалькі разоў перачытваў. Так лёс распарадзіўся, што давялося працаваць удалечыні ад Петрыкаўшчыны, але я заўсёды цікавіўся справамі раёна, неаднаразова наведваўся сюды.

У абласным камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні я курыраваў пытанні будаўніцтва і механізацыі, і праз службы, якія ўзначальваў, раён, як і астатнія ў вобласці, набываў новую тэхніку, дзякуючы чаму адбывалася перааснашчэнне сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, будавалася шмат аб'ектаў на сяле. Карацей кажучы, у адрыве ад раёна я ніколі не быў.

Убарць, ёсць вялікае возера Дзікае плошчай 69 гектараў. На тэрыторыі раёна адшукана 99 радовішчаў торфу з агульнымі запасамі 61,5 мільёна тон, радовішча калійных і каменных соляў, радовішча глінаў і суглінкаў з агульнымі запасамі 31,6 мільёна кубаметраў, крыніца мінеральнай вады і г.д.

— На пасадзе старшыні райвыканкама, Аляксандр Васільевіч, вы нядаўна, і мы разумеем, што за такі кароткі тэрмін, напэўна, немагчыма было ўвайсці ў курс спраў усіх арганізацый, непасрэдна наведаўшы іх. Тым не менш, якія першыя ўражанні засталіся ў вас пасля знаёмства з работай тых калектываў, у якіх вы паспелі пабываць? Ці прысутнічае ў стылі вашага кіраўніцтва так званы прынцып «новай мятлы»?

— Я не прыхільнік тасавання кіруючых кадраў. Але жыццё само падказвае, хто з іх у сённяшніх нялёгкіх умовах адпавядае сучасным патрабаванням, а хто «адстае ад цягніка», не спраўляецца са сваімі абавязкамі. Таму цалкам магчымыя і замены.

Прызнаюся: мне пакуль што не ўдалося наведаць усе арганізацыі. Іх у раёне шмат у розных сферах. Справа ў тым, што калі мяне прызначылі кіраўніком раёна, доўгі час не была занята пасада начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, і не на ўсіх сельгаспрадпрыемствах маглі пахваліцца, што там поўны парадак. Вось чаму першачарговая ўвага была нададзена ім. Цяпер складзены графік наведвання калектываў, якога і буду прытрымлівацца. А наогул райвыканкам працуе поруч з раённым Саветам дэпутатаў, які ўзначальвае Валянцін Дзяменцьевіч Рабушок.

АДРАДЖЭННЕ

— Асобная тэма размовы — рабочы візіт у канцы сёлетняга красавіка на Петрыкаўшчыну Прэзідэнта краіны і Дзяржаўная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Прыпяцкага Палесся на 2010—2015 гады. Вядома, што на рэалізацыю яе мерапрыемстваў прадугледжана выдаткаваць чатыры трыльёны рублёў. Якія сумы па вашым раёне?

— Кіраўнік дзяржавы неаднаразова адзначаў, што Прыпяцкае Палессе, у якое ўваходзіць сем раёнаў Гомельшчыны і Брэстчыны, можа стаць залатым дном пры ўмове пераўтварэння тутэйшых земляў, павышэння іх урадлівасці і развіцця аграэкатурызму. Для нашага раёна гэта праграма жыцця на бліжэйшыя гады, і рэалізацыя намечанага дасць магутны штуршок у развіцці ўсіх яго сфер. Дастаткова сказаць, што раёну прадугледжана да 2015 года выдаткаваць 377654 мільёны рублёў, з іх сёлета — 30062 мільёны. Скажу, што мы цяпер паралельна працуем над праграмай 2010 і 2011 гадоў, у тым ліку і па вырабе праектна-каштарыснай дакументацыі, чым займаюцца інстытуты «Гомельаблбудпраект» і «Палессепраект».

— Якія мерапрыемствы плануецца рэалізаваць у гэтыя тэрміны?

Дырэктар ААТ «Петрыкаўскі камбінат бытавога абслугоўвання» Аляксандр БАБІЧ (справа), загадчыца швейнага атэлье камбіната Алена МАЗУРКЕВІЧ і краўчыха Наталля ПІСКУН.

— Будаўніцтва камбікормавага завода ў ПУП «Палессеаграінвест» (2010—2011 гады). У 2011 годзе пачнецца аднаўленне аб'екта па выпуску фасфатзмяшчальных сапрапелевых угнаенняў на возеры Дзікім, закончыцца рэканструкцыя комплексу пад малочнатаварную ферму ў КСУП «Запаветы Ільіча», будаўніцтва ў КСУП «Камаровічы» малочнатаварнай фермы на 720 галоў буйной рагатай жывёлы і збожжаачышчальна-сушыльнага комплексу прадукцыйнасцю 30 тон у гадзіну.

З мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці выкарыстання меліяраваных земляў, прадухіленні дэградацыі іх і аграландшафтаў назаву распрацоўку і рэалізацыю схем землеўпарадкавання, рамонтна-эксплуатацыйныя работы на меліярацыйных і водагаспадарчых сістэмах, аграмеліярацыйныя мерапрыемствы, рэканструкцыю і аднаўленне меліярацыйных сістэм у шэрагу гаспадарак раёна.

Указаныя работы з мэтай павышэння ўрадлівасці земляў пасля рэкамендацый вучоных і спецыялістаў і дэталёвага эканамічнага аналізу праводзяцца ўжо цяпер і будуць працягвацца далей. У іх, у прыватнасці, задзейнічаны калектывы мясцовага прадпрыемства меліярацыйных сістэм і Капаткевіцкай ПМК-67 РУП «Калінкавічыводбуд», якім сёлета належыць асвоіць адпаведна 4900 і 5518 мільёнаў рублёў.

— А ў наступныя гады што будзе рэалізавана па Дзяржаўнай праграме?

— У 2011—2014 гадах будзе закуплена 1700 галоў БРЖ мясных парод для сельгаспрадпрыемства «Ляскавічы» ГПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі» і ПУП «Палессеаграінвест», пабудаваны малочнатаварныя фермы на 720 галоў БРЖ у 2012—2014 гадах у кожнай з трох гаспадарак — СВК «Кашэвічы», «Агра-Пціч» і КСУП «Капаткевічы».

— Аляксандр Васільевіч, Прэзідэнт краіны неаднаразова звяртаў увагу на тое, што Прыпяцкае Палессе вызначаецца багаццем прыроды, яе ўнікальнасцю, і трэба зрабіць усё, каб з гэтага была атрымана выгада...

— Не выкарыстаць гэты шанц было б недаравальна. Як вядома, на тэрыторыі раёна размешчана дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова «Нацыянальны парк «Прыпяцкі», які мае некалькі турыстычных баз. Тут створаны ўсе ўмовы для тых, хто хоча адпачыць камфартабельна на ўлонні прыроды. У турыстычным комплексе «Ляскавічы», напрыклад, ёсць лазня, прапаноўваецца харчаванне з традыцыйнымі беларускімі стравамі, маецца лодачная станцыя, дзе турысты могуць узяць напракат вёсельную лодку. Тут жа, на беразе Прыпяці, пабудаваны камфартабельны сучасны гасцінічны комплекс.

Да паслуг адпачывальнікаў нумары розных катэгорый, некалькі рэстаранаў і бараў, більярд, саўна з басейнам, пракат турыстычнага рыштунку, вялікая колькасць разнастайных прыродазнаўчых і гістарычных экскурсій, паслугі па арганізацыі палявання і рыбалкі і г.д. Невыпадкова прыродная прыгажосць і еўрапейскі камфорт прыцягваюць сюды тысячы турыстаў, якія трацяць тут валюту. Дарэчы, у пачатку сёлетняга года пры Нацыянальным парку адкрыўся «Сафары-парк», які абяцае стаць экалагічным турыстычным аб'ектам не толькі ў нашай рэспублiцы, але і ў Еўропе.

— А як ідуць справы з аграэкатурызмам?

— Па стане на першае ліпеня ў раёне зарэгістравана сем аграсядзібаў: «Дзед Талаш», «Хутарок», «Каралёў стан», «Ніколін бераг», «Ляшынскене», «Багамазаў двор» і «ГрыМарынка». Плануецца адкрыць аграгурыстычны комплекс на базе СВК «Кашэвічы». З верасня 2009 года паслугі ў сферы аграгурызму аказвае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Тарока», адкрыты турыстычны комплекс у вёсцы Снядзін, вядзецца рэканструкцыя будынка пад турыстычны комплекс у вёсцы Конкавічы. На тэрыторыі Лучыцкага сельсавета лясгас увёў у эксплуатацыю домік паляўнічага і рыбака.

Хачу сказаць, што ў раёне шмат цікавых месцаў, якія, як той казаў, мала раскручаныя. Гэта і Успенская царква, пабудаваная ў XVII стагоддзі без адзінага цвіка, алтар якой стаіць на манументальным валуне; і адзін з найвышэйшых пунктаў Гомельшчыны гара Калпак, на схіле якой б'е крыніца і вада якой лічыцца гаючай; і Рымшава гара, вакол якой столькі паданняў, і руіны будынка XIX стагоддзя пана Вільсана, дзе быў дзівосны сад і вялікі парк з рэдкімі раслінамі і дрэвамі.

Аграэкатурызм прыносіць дадатковы заробак вяскоўцам, і мы будзем яго развіваць далей, бо ён да таго ж, як ужо было сказана, з'яўляецца часткай Дзяржаўнай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Прыпяцкага Палесся.

Адміністратар доміка рыбака і паляўнічага каля вёскі Лучыцы Сяргей ЯКАВЕЦ.

У дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Пціч».

ВЫСОКАЕ НАПРУЖАННЕ

У суправаджэнні намесніка старшыні райвыканкама Віталя Уладзіміравіча Пілера мы пабывалі ў некаторых арганізацыях раёна. Начальніка Капаткевіцкай ПМК-67 Васіля Іванавіча Каляду сустрэлі на полі КСУП «Чалюшчавічы», дзе, згодна з Дзяржаўнай праграмай, ужо тры месяцы праводзіцца рэканструкцыя раней асушаных земляў на плошчы 420 гектараў. 160 з іх ужо пушчаныя ў абарот, засеяныя, для чаго быў закончаны цэлы комплекс работ.

Яны працягваюцца на астатніх плошчах, дзе высякаюцца хмызнякі, кустоўе, выкарчоўваюцца пні, прыводзяцца ў парадак адхоны канала, рыхтуецца ачыстка яго ад мулу, укладваюцца дрэнажныя трубы, рамантуецца шлюз рэгулятара. Высокае напружанне, адным словам, якое чакаецца сёлета і на аб'ектах іншых сельгаспрадпрыемстваў.

Ва ўрочышчы Капцэвічы мы назіралі за работай механізаванага атрада райаграсэрвіса і СВК «Кашэвічы» на нарыхтоўцы кармоў. На іх было занята 12 аўтамашын, камбайн «Ягуар» і гомсельмашаўская касілка. Кіраўнік гаспадаркі Ігар Генадзьевіч Кучынскі расказаў, што ўжо нарыхтавана 17,5 цэнтнера кармавых адзінак травяністых кармоў на кожную жывёліну пры плане 28 цэнтнераў, і задача зрабіць паўтарагадовы запас іх (42 цэнтнеры) абавязкова будзе выканана.

Пераможца рэспубліканскага і абласнога спаборніцтва за мінулы год ААТ «Петрыкаўскі КБА» для выканання высокіх прагнозных паказчыкаў прапанаваў аказваць свае паслугі насельніцтву Хойніцкага раёна, што паспяхова і робіць.

На хлебазаводзе закончылася рэканструкцыя вытворчасці, у выніку чаго абнавіўся асартымент прадукцыі, палепшылася яе якасць і з'явілася магчымасць пастаўляць хлебабулачныя вырабы ў суседнія раёны і на рынкі абласнога цэнтра.

У Залескай сярэдняй школе пад кіраўніцтвам дырэктара, заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь, выдатніка адукацыі Валянціны Рыгораўны Еўтушэнка вырошчваецца 56 відаў лекавых раслін, ёсць сад, дзейнічае мінізаапарк з экзатычнымі страусамі, паўлінамі, фазанамі.

Наведалі мы таксама дзіцячы санаторый «Пціч», Успенскую царкву ў Кашэвічах, домік паляўнічага і рыбака ў Лучыцах, аграсядзібу «Хутарок» у вёсцы Дземенка, і паўсюдна бачылі працавітасць і стараннасць палешукоў, паўнавартаснае жыццё раёна...

Намеснік старшыні райвыканкама Віталь ПІЛЕР і начальнік філіяла ПМК-67 «Капаткевічы» РУП «Калінкавічыводбуд» Васіль КАЛЯДА на ўчастку пракладкі дрэнажу закрытым спосабам.

Машыніст экскаватара Аляксандр ЦЕПЛЯКОЎ рыхтуе пляцоўку для меліяратыўных работ.

Гаспадар аграсядзібы «Хутарок» Сяргей ХОДЗЬКА гасцінна запрашае ў адну з прыгажэйшых палескіх мясцін.

Энтузіязм і энергія дырэктара Залескай сярэдняй школы Валянціны ЕЎТУШЭНКА ператварылі школьную тэрыторыю ў казачны куточак.

Майстар-пекар хлебазавода Святлана КАРАБЕЙКА каля новай лініі па вытворчасці белабулачных вырабаў.

Металічная агароджа — больш мабільнае вырашэнне гарадской гаспадаркай эстэтычнага выгляду вуліц.

Каля «жалезнага паляўнічага», які з нядаўняга часу ўпрыгожвае горад, начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Аляксандр КЛІНДУХОЎ.

Матэрыял падрыхтавалі Алена ДАЎЖАНОК, Віктар БОЙКА, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

УНН 400065489.

HONOR BANK
ОНЕРБАНК
Закрытое акционерное общество

ЗАО «Онербанк»
220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51.
Тел./факс 306 25 91.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г.
ЗАО «Онербанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	457,8	-
3	Средства в Национальном банке	1102	33,9	-
4	Ценные бумаги:	1103	24 445,9	-
	для торговли	11031	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	-	-
	в наличии для продажи	11033	24 445,9	-
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	23 116,9	-
6	Кредиты клиентам	1106	-	-
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	-	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	926,5	-
9	Прочие активы	1109	3 948,8	-
10	ИТОГО активы	110	52 929,8	-
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	7 921,3	-
14	Средства клиентов	1206	278,1	-
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	-	-
16	Прочие обязательства	1209	2 727,4	-
17	ВСЕГО обязательства	120	10 926,8	-
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	46 710,0	-
20	Эмиссионный доход	1212	-	-
21	Резервный фонд	1213	-	-
22	Накопленная прибыль	1214	(-4 707,0)	-
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	-	-
24	ВСЕГО капитал	121	42 003,0	-
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	52 929,8	-
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	27 987,2	-
28	Обязательства	1302	32 028,9	-

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 г.
ЗАО «Онербанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	5	6
1	Процентные доходы	2011	1 644,9	-
2	Процентные расходы	2012	24,5	-
3	Чистые процентные доходы	201	1 620,4	-
4	Комиссионные доходы	2021	0,5	-
5	Комиссионные расходы	2022	83,4	-
6	Чистые комиссионные доходы	202	(-82,9)	-
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	(-1 690,0)	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Доход в форме дивидендов	205	-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	412,7	-
11	Прочие доходы	207	83,2	-
12	Операционные расходы	208	1 566,2	-
13	Прочие расходы	209	2 658,8	-
14	Налог на прибыль	210	-	-
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	(-4 707,0)	-

Председатель Правления **М. Талеби Гелин Гешлаги**
Главный бухгалтер **Л. И. Кислюк**
Дата подписания «12» июля 2010 г.

Лицензия на осуществление банковских операций, выданная НБ РБ № 32 от 16.10.2009 г.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (7 ліпеня). Па гарызанталі: Рэндзю. Жарабок. Тура. Гардэ. Туга. Доза. Кабура. Жар. Кавалак. Асоба. Аркан. Мула. Літара. Кабукі. Сакура. Нар. Лот. Груда. Балет. Ула. Тачка. Друкар. Хабар. Сушы. «Краб». Перакат. Апостал. **Па вертыкалі:** Пратакол. Імамат. Гавот. Амулет. Алюр. Рота. Зніч. Арат. Гонка. Краска. Страз. Бурт. Ражок. Шаша. Атрад. Рыба. Экран. Год. Маўр. Бром. Бурундук. Рэал. Каала. Гейша. Амір. Арсенал.

Сканворд (8 ліпеня). Па гарызанталі: Перл. Крашчацік. Пірога. Скала. Каска. Рок. Кораб. Удаў. «Апостал». Акр. Яхант. Акот. Абабак. Апе. Няміга. Сеул. Нар. Отс. Бахіл. Агата. Ком. Аніка. Канапа. Амулет. Нона. Ізабар. Воля. Фантанка. **Па вертыкалі:** Дэрыбасаўская. Крона. Балота. Сатрап. Танзанія. Лупа. Кекс. Сакля. Клунак. Корак. Лоб. Аорта. Кенаф. Алгол. Тара. Арбат. Бук. Мяса. Кура. Клініка. Жако. Галоп. Твар. Марошка.

Сканворд + судоку (9 ліпеня). Па гарызанталі: Схема. Касагор. Край. Апаш. Нар. Гага. Шкот. Рагач. Дыскатэка. Сыч. Парк. Іжора. «Рэал». Мэн. Батарэйка. Іран. Скот. Адат. Аса. Улан. Айсберг. **Па вертыкалі:** Джамалунгма. Хурма. Гасцініца. Майна. Асоба. Марш. Тырана. Крэчат. Допінг. Араго. Ага. Трап. Арэс. Рэйка. Какос. Рэчышча. Лата. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

6	4	3	5	1	8	9	2	7
5	1	2	9	4	7	6	8	3
9	8	7	6	3	2	5	4	1
3	9	5	4	8	6	1	7	2
2	7	1	3	9	5	8	6	4
8	6	4	2	7	1	3	5	9
7	3	6	1	5	4	2	9	8
4	2	9	8	6	3	7	1	5
1	5	8	7	2	9	4	3	6

СЁННЯ

Месяц
Маладзік 11 ліпеня.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	**4.55**	**21.35**	**16.40**
Віцебск —	**4.37**	**21.32**	**16.55**
Магілёў —	**4.45**	**21.25**	**16.40**
Гомель —	**4.50**	**21.13**	**16.23**
Гродна —	**5.12**	**21.48**	**16.36**
Брэст —	**5.21**	**21.41**	**16.20**

Імяніны
Пр. *Ангеліны, Дзям'яна, Кузьмы, Нікадзіма, Пятра.*
К. *Ангеліны, Ізабелы, Бенавентуры, Каміля, Марцэля, Нікадзіма, Якуба.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

14 ліпеня

1916 год — руская Стаўка пастанавіла спыніць наступленне пад Баранавічамі, у ходзе якога рускія войскі страцілі 80 тысяч загінуўшымі.

1789 год — паўстаўшым народам была захоплена крэпасць-турма Бастылія, сімвал абсалютызму. Гэты дзень лічыцца датай пачатку Вялікай французскай рэвалюцыі.

Цытата дня:

«Калі жанчына злуецца, здаровага сэнсу ў яе словах не шукай».
П'ер Агюстэн Бамаршэ (1732—1799), французскі драматург.

БУЛЬБА — УНІВЕРСАЛЬНЫ ПРАДУКТ

Здароўе на талерцы

Бульба — параўнальна нядаўні прадукт на нашых землях. Прывычнае для яе месца на нашым стале бульба пачала займаць толькі ў пачатку XIX стагоддзя, паступова выцясняючы рэпу, якую дагэтуль прымянялі ў той жа якасці: варылі, расціралі ў пюрэ, запякалі і г.д. Сёння немагчыма ўявіць, што ў той час падымаліся сапраўдныя «бульбяныя бунты» — так не хацелі сяляне саджаць заморскі «земляны яблык» з-за шматлікіх атручэнняў ад ужывання пладоў...

Чаго там толькі няма. Хімічны склад бульбы ўнікальны. У кожным звычайным клубні ўтрымліваюцца бялкі, крухмал, цукрыды, клятчатка, пекцінавыя рэчывы, арганічныя кіслоты (лімонная, яблычная, шчаўлевая і інш.), незаменныя амінакіслоты, тлушчы, вітаміны B_1, B_2, B_3, B_6, B_9, C, K, караціноіды, вада, мінеральныя рэчывы і мікраэлементы: калій, кальцый, натрый, магній, сера, фосфар, хлор, жалеза, цынк, медзь, марганец, бор, алюміній, ёд, кобальт і інш. Хочаш — еш, а хочаш — лячыся.

З бульбы гатуюць сотні страў — ад самай карыснай печанай бульбачкі да вельмі шкодных (але ад гэтага не менш прывабных) чыпсаў. І спрачацца аб густах мы тут не будзем. Успомнім толькі некалькі важных рэчаў.

1. Амаль усе карысныя рэчывы знаходзяцца ў лупіне і адразу пад ёй, таму, калі ёсць магчымасць, не зразайце яе.

2. Існуе меркаванне, што абабраную бульбу карысна вымочваць нейкі час у вадзе — тады з яе «выходзяць» шкодныя хімічныя рэчывы, якімі яе апрацоўвалі на градках. Можа, і так, але вітамін С з яе таксама «выйдзе».

3. Страў з бульбы сотні, а асноўных спосабаў яе прыгатавання значна менш. Пра густы не спрачаюцца, але і каларыйнасць ніхто не адмяняў.

Прыкладная каларыйнасць бульбы (на 100 г гатовага прадукту)

Печаны клубень	— 77 ккал
Бульба адварная	— 80 ккал
Бульбяное пюрэ	— 82 ккал
Бульба смажаная	— 210 ккал
Бульба фры	— 279 ккал

Бульба па-княжацку

Звараную ў мундзіры бульбу астудзіць, ачысціць і нарэзаць скрылікамі. У форму, змазаную сметанковым маслам, выкласці некалькімі слаямі бульбу, сметанковае масла і тварог так, каб верхні слой быў з бульбы. Зверху заліць яечнымі жаўткамі, змешанымі з невялікай колькасцю малака, і запячы ў духоўцы да гатоўнасці. Пры падачы пасыпаць здробненым зяленівам.

Багацце выбару. Вось дзе можна павыбіраць і пакапрызнічаць. Выбіраем любыя гатункі, але заўсёды памятаем некалькі агульных правілаў.

1. Незалежна ад гатунку, бульба павінна быць цвёрдая. Мяккая, зморшчаная, праросłая — НЕ!

2. Зялёныя плямы на клубнях — вынік няправільнага захоўвання. Іх давядзецца зразаць. Вялікая частка лупіны зялёная — НЕ БЯРОМ!

3. Захоўваецца бульба ў цёмным, сухім, прахалодным месцы. Лепш, калі яно вентылюецца. У цяпле яна хутка прарасце, у халадзільніку пачне плеснець, а на святле пазелянее (гл. п. 2). Самая лепшая тэмпература для захоўвання — 10 °С.

4. Мыць бульбу перад закладкай на захоўванне нельга — запляснее, а потым і гніць пачне.

Хатні доктар. У разумных колькасцях бульба яшчэ і лечыць.

● Хваробы сэрца, зніжэнне артэрыяльнага ціску, умацоўванне крывяносных сасудаў, рэгуляванне абмену рэчываў — бульбяная дыета.

● Загойванне язваў, апёкаў, лячэнне экзэм і дэрматытаў, болі пры гемароі — сырая дзёртая бульба.

● Здымае спазмы, загойвае, лечыць пякотку, праганяе млоснасць, мае паслабляльны эфект, карысны пры гіпа- і авітамінозе — бульбяны сок. Апошні таксама цудоўна ачышчае арганізм ад шлакаў, калі яго змяшаць яшчэ з сокам морквы і сельдэрэю. Акрамя ўсяго пералічанага, 3-4 ст. лыжкі такога соку штодзень падтрымліваюць арганізм пры нервовых парушэннях.

● Прастуда, бранхіты — адварная бульба ў мундзіры (інгаляцыі).

● Клятчатка бульбы не раздражняе слізістую страўніка і кішэчніка, вараную бульбу можна есці нават у перыяд абвастрэння гастрыту і язвы.

● Увага: пры цукровым дыябеце — пракансультавацца з урачом!

Бульба-касметолаг

Маска-кампрэс для валасоў і скуры галавы: *2 бульбіны сярэдняга памеру, 1 жаўток, 1 ч. лыжка алею, 1 ч. лыжка мёду, 1 ч. лыжка марской солі (можна звычайнай).*

За 30—40 хвілін да мыцця ўцерці маску ў скуру галавы, карані валасоў і размеркаваць па ўсёй даўжыні. Ухутаць ручніком. Рэкамендуецца рабіць маску 1 раз на тыдзень — валасы становяцца бліскучымі і шаўкавістымі.

Малачко для ўвільгатнення скуры твару: *вазьміце 120 мл бульбянога адвару, 140 мл малака, змяшайце, пераліце ў бутэлечку і захоўвайце ў халадзільніку. Перад выкарыстаннем энергічна ўстрэсвайце. Нанясіце малачко на твар, трымайце 10—15 хвілін, затым зніміце рэшткі з дапамогай папяровай сурвэткі.*

Для агрубелай і перасушанай скуры рук: *надзерці адну бульбіну, перамяшаць з чайнай лыжкай мёду, дадаць некалькі кропель лімоннага соку. Трымаць маску 10—15 хвілін, змыць цёплай вадой і змазаць пажыўным крэмам.*

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Усміхнемся!

Муж і жонка сварацца. Раптам у дзверы іх кватэры звоніць суседскі хлопчык:

— Прабачце, тата прасіў даведацца, па якім канале ідзе такая цікавая перадача.

☺

Рымскі-Корсакаў. «Палёт чмяля» для вувузелы з аркестрам. У антракце — смажаны васьміног.

☺

Мама размаўляе з настаўнікам свайго сына:

— Сяргей Іванавіч, калі ласка, не сварыцеся на нашага Вовачку! Ён пяшчотнае і слабае дзіця. Мы з мужам ніколі яго не білі, хіба што ў мэтах самаабароны...»

☺

У Адэсе на цыгарэтных пачках напісана: «Мамачка даведаецца — заб'е».

☺

Учора ўсёй групай здавалі на правы... Па 200 даляраў з брата.



Інфарм-укол

Скіньце стрэс на мышцы

Сучасны тэмп жыцця, інфармацыйныя патокі, безумоўна, перагружаюць наш арганізм. Нярэдка спраўляцца з перанапружаннем, стрэсамі можа спрыяць развіццю памежных нервова-псіхічных расстройстваў. Спецыялісты рэкамендуюць вучыцца адэкватнаму рэагаванню на складаныя сітуацыі і канфлікты. Належныя веды і навыкі рэальна дапамагаюць пазбегнуць шоку. Наогул любыя праблемы — ад фінансавых да сэксуальных — трэба вырашаць, бо парушэнні ў любым з аспектаў жыцця робяць свой унёсак у агульны стрэс.

Аднак псіхічныя захворванні абумоўлены яшчэ цэлым шэрагам прычын. Свой унёсак робіць спадчынны фактар, асабліва ва ўзнікненні такога захворвання, як шызафрэнія. Сваё месца — у асаблівасцяў псіхікі канкрэтнай асобы, умоў, у якіх чалавек выхоўваўся. Уплывае нават экалагічны фактар і лад харчавання. Акрамя таго, некаторыя псіхічныя захворванні развіваюцца на фоне захворвання цялеснага — артэрыяльнай гіпертэнзіі, атэрасклерозу. Выклікаць праблему з псіхікай можа чэрапна-мазгавая траўма, эпілепсія, хвароба Альцгеймера.

Калі чалавек своечасова не звяртаецца па псіхіятрычную дапамогу, то паступова хвароба набывае хранічны, незваротны характар, а значыць, магчымасці спецыялістаў становяцца вельмі абмежаванымі і чакаць вылячэння ўжо не даводзіцца. Вельмі важна прызнаваць сваю праблему, шукаць спосабы яе вырашэння і строга выконваць усе прадпісанні ўрачоў. Апошнія нясуць адказнасць за дакладнае вытрымліванне прататколаў дыягностыкі і лячэння, бяспеку і эфектыўнасць дапамогі. Аднак жыць за пацыента здаровым жыццём яны не ў стане. Гэтаксама як і займацца прафілактыкай нервова-псіхічных захворванняў.

Звярніце ўвагу на самадапамогу — медытацыю, методыкі дыхання, нервова-мышачную рэлаксацыю, загартоўванне. Уся ўсходняя медыцына пабудавана на той жа тэхніцы дыхання. Асвоіць такую практыку зусім не складана. Іншая рэч, яна павінна быць сістэмнай. Гэта ж датычыцца і заняткаў спортам, падчас якіх мы ўвесь наш стрэс, што называецца, скідваем на мышцы. Акрамя таго, неабходна надаваць належную ўвагу пашырэнню свайго кругагляду, культурнаму развіццю. І не захапляйцеся самастойным прыёмам заспакаяльных сродкаў. Вам можа падацца, што вы перамагаеце стрэс, а насамрэч будзеце спрыяць развіццю трывожнага ці дэпрэсіўнага расстройства. З іншага боку, можна набыць і залежнасць ад псіхаактыўных рэчываў.

Тайм-менеджмент патрэбны ўсім

Не імкніцеся ўсё паспець. Адна з хрысціянскіх каштоўнасцяў — няспешнасць. Час ад часу варта прыпыняцца і думаць над тым, куды і навошта мы рухаемся.

Нярэдка людзі арыентуюцца не на свае патрэбы, а на чужое меркаванне. Спецыялісты рэкамендуюць вучыцца тайм-менеджменту — мастацтву кіравання сваім часам. Каб дасягнуць уласных мэтаў, неабходна прадумаць, па якой дарозе ісці. Праблема перфекцыяністаў у тым, што яны імкнуцца зрабіць як мага больш і з максімальным вынікам. У такіх выпадках карысна папрацаваць з псіхолагам. Справіцца з сітуацыяй, якая выйшла з-пад кантролю, дапаможа і такі кірунак у псіхалогіі, як коўчынг. Ім займаюцца псіхолагі і псіхатэрапеўты, якіх у гэтым выпадку называюць трэнерамі па жыцці. Такія спецыялісты дапамагаюць зрабіць тое, што ты ўмееш, яшчэ лепш.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Прыміце да ведама

Амерыканскія горкі — пагроза вашым вушам і сэрцу

Амерыканскія вучоныя правялі даследаванне, у якім паказалі небяспеку атрымання баратраўмы падчас наведвання амерыканскіх горак.

Крутыя павароты, пад'ёмы і спускі, высокая хуткасць амерыканскіх горак прыносяць шмат вострых адчуванняў, але, калі вы будзеце паводзіць сябе неасцярожна, горкі могуць прывесці да парушэння слыху, сцвярджаюць медыкі.

Гэтае даследаванне медыкаў упершыню змяшчае інфармацыю, што існуе прычынна-выніковая сувязь паміж сілай паскарэння на горках і агульнай траўмай вуха — вушная баратраўма. Каб растлумачыць, што адбываецца, трэба разумець сістэму: імгненная змена ціску вонкавага асяроддзя перад барабанай перапонкай, барабанная перапонка і ціск у прасторы сярэдняга вуха.

Баратраўма вуха праяўляецца ў часовай страце слыху; часцей за ўсё ўзнікае галавакружэнне, дыскамфорт або боль у вуху, адчуванне, што вушы залажыла.

Аўтары даследавання раяць: пасажыры падчас атракцыёна павінны заставацца ўвесь час тварам наперад, каб не даць магчымасці паскарэнню ўздзейнічаць на барабанную перапонку. Таксама яны рэкамендуюць наведвальнікам амерыканскіх горак захоўваць асцярожнасць. Падчас руху па амерыканскіх горках нельга ў моманты найбольшага паскарэння паварочваць галаву налева або направа.

Баратраўма на амерыканскіх горках адбываецца раптоўна, і гэта бянтэжыць чалавека, хоць для таго, каб выраўняць ціск, трэба проста пазяхнуць або пажаваць гумку.

Дарэчы, на думку кардыёлагаў, людзі з хворым сэрцам, слабымі сасудамі павінны ўвогуле адмовіцца ад катання на амерыканскіх горках. Вострыя адчуванні і эмацыйнае напружанне, якія дорыць атракцыён, выклікаюць збой сардэчнага рытму, здольны прывесці да сур'ёзных парушэнняў сардэчнай дзейнасці.

Варта зазначыць, што амерыканскія горкі лічацца самым экстрэмальным атракцыёнам ва ўсім свеце. Па колькасці адрэналіну, які выкідваецца ў кроў, хуткаснае катанне можа параўнацца з парашутнымі скачкамі або з прагулкай пад ветразем на хвалярэзе. Медыцыне нават вядомы выпадак, калі такі экстрэмальны адпачынак дапамог зацяжараць адной нямецкай даме. Моцныя адчуванні ўзнялі настрой жанчыне, якая беспаспяхова спрабавала нарадзіць дзіця, і гэта пазітыўна адбілася на яе здольнасці да зачацця.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ШАФЕР І ШАФЕРКА, ДРУЖКІ, МАРШАЛКІ, ДРУЖБАНТЫ

У традыцыйным беларускім вяселлі звычайна была задзейнічана не толькі блізкая і далёкая радзіна жаніха і нявесты, але і амаль усё насельніцтва вёскі. Разам з тым, складаная вясельная ўрачыстасць вымагала наяўнасці абавязковага кола людзей, якія павінны былі выконваць самыя адказныя абрадавыя ролі. Звычайна пералік іх паўнамоцтваў і абавязкаў быў дакладна вызначаны шматгадовай традыцыяй і не дазваляў аніякіх адхіленняў ці неабгрунтаваных парушэнняў (напрыклад, традыцыя дакладна прадпісвала, хто павінен выпякаць каравай, хто яго будзе выносіць, хто яго будзе дзяліць). Лічылася, што кожны з удзельнікаў, а тым больш з галоўных вясельных чыноў, мог паўплываць на само развіццё ўрачыстасці і на будучы лёс маладых, таму да выбару людзей, на якіх будуць усклады ключавыя абавязкі, ставіліся вельмі адказна.

● Бліжэй за ўсё да жаніха і нявесты знаходзіліся (і ў сэнсе паўсядзённых стасункаў, і ў плане фармальнага знаходжання — пасадкі за вясельным сталом) іх самыя блізкія сябры — шафер і шаферка. «Шафер, дружка — вясельны чын, якіх па два ці больш побач з жаніхом і нявестай, дапамагае і аказвае паслугі; яны ж трымаюць вянцы над парай — гэта шаферская справа, абавязак».

● Шафер — бліжэйшы сябра жаніха. Шаферка — сяброўка нявесты, часцей за ўсё менавіта з ёй нявеста «кумілася» на Тройцу. Клятва аб сяброўстве двух дзяўчат звязвала іх да моманту вяселля адной з іх. Дружак у жаніха было звычайна двое — вялікі і малы, старэйшы і малодшы; у некаторых выпадках дружак было сем, часам — дванаццаць.

● Дружкі жаніха і нявесты выдзяляліся з усіх удзельнікаў вясельнай урачыстасці спецыяльнымі знакамі адрознення. Хлопцаў абвязвалі ручніком, павязвалі на руку чырвоную стужку, але часцей за ўсё на грудзі шаферам і шаферкам мацавалі букецікі з сушаных кветак і стужачак. «Скупіць дружак» — так звалі на Беларусі той абрад, калі дружкам павязвалі ручнікі, а тыя павінны былі адкупіцца грашыма.

● Адносіны паміж шаферам і шаферкай не абмяжоўваліся толькі вясельным сталом ці ўрачыстасцю ўвогуле. Паступова яны маглі складвацца ў цэласную сістэму міжродавых сувязяў. Было добрым знакам, калі шаферку ці шафера пазней запрашалі стаць хроснымі бацькамі ў першынца, ці калі шаферы праз некаторы час самі ладзілі вяселле, станавіліся жаніхом і нявестай, г.зн. пераймалі «вясельную» эстафету.

● У гэтым месцы было б пажадана зрабіць адно істотнае ўдакладненне. Часам маладыя людзі могуць загадзя дамовіцца пра тое, каб **хрысціць дзяцей адзін у аднаго**: мы — вашых, а вы — нашых. Рабіць гэта **вельмі не пажадана**, таму што будзе парушана важнае правіла народнай культуры: **муж і жонка не могуць быць хроснымі бацькамі аднаго і таго ж дзіцяці**.

● Вельмі важна памятаць пра яшчэ адно прынцыповае правіла: **імя шаферкі не павінна супадаць з імем нявесты, а імя шафера — з імем жаніха**.

● Шафер і шаферка ў розных рэгіёнах Беларусі звaліся па-рознаму: **дружкі, маршалкі, баяркі, старшая сяброўка, галоўная дружка і яго намеснік, паджанішок**. Сёння шырокае распаўсюджванне атрымала афіцыйна-грамадзянская назва іх статусу — гэта ганаровыя сведкі, якія павінны сваёй прысутнасцю і сваімі подпісамі ў кнізе рэгістрацыі грамадзянскіх актаў пацвердзіць сапраўднасць шлюбу дваіх маладых людзей.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ПААБЯЦАЎ ЗРАБІЦЬ ЗРУБ

У Віцебску жанчына заявіла ў міліцыю пра тое, што індывідуальны прадпрымальнік яшчэ восенню мінулага года ўзяў з яе 4 мільёны рублёў за выраб зрубу, але ні зрубу, ні грошай.

Высветлілася, што 40-гадовы бізнэсмен ужо быў раней судзімы за махлярства. Цяпер у дачыненні да яго заведзена яшчэ адна крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, скаратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3389. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі

НАЙВЫШЭЙШАЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРЫ НАЙМЕНШЫХ ВЫДАТКАХ – ГЭТА ПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

Чатыры гады таму на базе Інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі створаны «Навукова-практычны цэнтр па механізацыі сельскай гаспадаркі», з тым жа падпарадкаваннем Акадэміі навук. Гэты акт, аднак, не з'явіўся простай зменай назвы. Навукова-практычны цэнтр адразу ж набыў больш важкі статус ва ўсёй сваёй дзейнасці, стаў каардынуючым і накіроўваючым у краіне органам у справе механізацыі, электрыфікацыі і аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў у сельскай гаспадарцы, што надало сістэмнасць усёй гэтай рабоце, дазволіла сканцэнтраваць намаганні навукоўцаў, канструктараў і сельскіх працаўнікоў на пэўных, найбольш актуальных кірунках, у многім садзейнічала пазбаўленню пры распрацоўцы тэхнічных сродкаў для сельскай гаспадаркі ад паралелізму і дубляжу. Навукова-практычны цэнтр ужо адразу паставіў сваёй мэтай фарміраванне сістэм машын, машынных комплексаў (і адпаведнае навуковае суправаджэнне гэтай ідэі), якія б у пэўнай сельскагаспадарчай галіне «вялі» ўсе тэхналагічныя працэсы ад пачатку і да канца, забяспечвалі тэхналагічную непарыўнасць гэтых працэсаў. Мэтай Навукова-практычнага цэнтра стала стварэнне тэхналагічных комплексаў сучасных айчынных машын і абсталявання для механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, якія б не саступалі лепшым замежным узорам.

НПЦ з'яўляецца заснавальнікам наступных даччыных прадпрыемстваў:

*** эксперыментальнага завода з філіяламі ў Мінску і ў Ждановічах (на іх вырабляюцца ўзоры новай тэхнікі па канструктарскіх распрацоўках спецыялістаў НПЦ);**

*** эксперыментальнай базы «Зазер'е» (сельскагаспадарчы кірунак);**

*** прадпрыемства «Інстытут «Плодаагароднінапраект»;**

*** вытворчага прадпрыемства «Конус» (інавацыйныя распрацоўкі ў галіне электронных сістэм кіравання ў сельскагаспадарчых галінах).**

У склад НПЦ уваходзяць шэраг аддзелаў і спецыялізаваных лабараторый.

Сёння мы змяшчаем інтэрв'ю з генеральным дырэктарам НПЦ Уладзімірам Самасюком.

ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Уладзімір Георгіевіч Самасюк пачынаў сваю працоўную дзейнасць пасля заканчэння Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута на прадпрыемствах Мінсельбуда і Дзяржкамсельгастэхнікі БССР, у свой час узначальваў рэспубліканскі будаўнічамантажны трэст «Аграбудмантаж» Дзяржагрtoпрама. Працаваў таксама начальнікам Мінскага абласнога праектна-прамысловa-будаўнічага аб'яднання, начальнікам аддзела Мінскага аблвыканкама, намеснікам міністра сельскай гаспадаркі.

З 2003 года па красавік 2006-га — генеральны дырэктар аб'яднання «Белаграсэрвіс», з красавіка 2006 года — узначальвае навукова-практычны цэнтр.

У 1997 годзе закончыў Акадэмію кіравання, кандыдат эканамічных навук. З'яўляецца членам калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі, членам бюро Аддзялення аграрных навук Нацыянальнай акадэміі, старшынёй вучонага савета цэнтра, удзельнічае ў працы шэрагу іншых навуковых і грамадскіх арганізацый.

Займаецца не толькі гаспадарчай, практычнай работай, але і навуковай, чытае курс лекцый для слухачоў Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта.

— Уладзімір Георгіевіч, напачатку больш дакладна акрэсліце асноўныя кірункі дзейнасці вашага цэнтра.

— Гэтыя кірункі дакладна абазначаны ў нашых заснавальніцкіх дакументах і перш за ўсё заключаюцца ў пошуку з дапамогай навуковых даследаванняў перспектыўных шляхоў у справе механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, у вывучэнні і абагульненні адпаведнага сусветнага перадавога вопыту, аналізе пэўных тэндэнцый, у прагназаванні ўсяго гэтага працэсу, распрацоўцы тэарэтычных асноў для стварэннях тых ці іншых сродкаў механізацыі і прымянення тых ці іншых тэхналогій у важнейшых галінах аграпрамысловага комплексу. Карацей кажучы, мы ва ўсім гэтым працэсе, ва ўсёй гэтай справе павінны вывучаць, абагульняць і каардынаваць. Ну, а калі зыходзіць з больш практычнага пункта гледжання на гэтую справу, намаганні цэнтра, яго спецыялістаў у першую чаргу павінны быць скіраваныя на паскоранае ўкараненне ў сельскагаспадарчую вытворчасць новых, сучасных тэхналогій і тэхнічных сродкаў, на распрацоўку сістэм машын, якія забяспечвалі б поўную механізацыю вытворчых працэсаў у той ці іншай галіне раслінаводства або жывёлагадоўлі — ад самага пачатку і да канца, сістэм машын, якія працавалі б у адзіным непарыўным тэхналагічным ланцугу. Асабліва падкрэслю: гэта павінны быць менавіта сістэмы машын, якія дзейнічалі б у адзіным тэхналагічным ланцугу, патоку, арганічна змянялі адна другую. Для нас, для нашага аграпрамысловага комплексу гэта асабліва важна. Гэта павінны быць сістэмы машын, сістэмы машынных комплексаў, якія неслі б з сабой, рухалі развіццё энергазберагальных, экалагічна чыстых сельскагаспадарчых тэхналогій, якія забяспечвалі б найвышэйшую прадукцыйнасць працы і максімальна нізкі сабекошт сельскагаспадарчай прадукцыі, у цэлым інтэнсіўны шлях развіцця сельскай гаспадаркі.

Асабліва падкрэслю: у цэнтры сістэмна вядзецца работа па стварэнні тэхнікі. Менавіта сістэмна. Першае, што мы зрабілі, каб забяспечыць гэтую сістэмнасць, — вызначыліся з асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі, куды перадаём дакументацыю на нашы вырабы (гэта прадпрыемствы Міністэрства прамысловасці, «Белаграсэрвіса»). Стварылі таксама інавацыйна-тэхналагічныя палігоны, дзе выпрабоўваем сваю тэхніку і адначасова правяраем вынікі нашых навуковых даследаванняў, — у прыватнасці, на нашай эксперыментальнай базе «Зазер'е» ў Пухавіцкім раёне, а таксама ў Мазыры, у Лідскім раёне. Зразумела ўжо, нашы распрацоўкі з'яўляюцца распрацоўкамі інавацыйнага складу, і мы на гэтым інавацыйным шляху пастаянна звяраемся з практыкай.

— Уладзімір Георгіевіч, усю шматгранную дзейнасць цэнтра даволі цяжка ўкласці ў нейкія канкрэтныя лічбы, паказчыкі і, тым не меней, ці можна назваць хоць нейкія абагульняючыя вынікі?

— На базе сваіх навуковых даследаванняў мы займаемся і непасрэдна стварэннем новай, сучаснай сельскагаспадарчай тэхнікі, распрацоўкай адпаведнай канструктарскай дакументацыі. Дык вось, на сёння 60—80 працэнтаў прычапной тэхнікі, якая выпускаецца ў рэспубліцы (а гэта сеялкі, бульбасаджалкі, культыватары, машыны для ўборкі ўраджаю і г.д.), вырабляецца менавіта па нашых распрацоўках. (Тут жа варта ўдакладніць: акрамя прычапной тэхнікі, у цэнтры актыўна распрацоўваюць і самаходную тэхніку. Гэта, напрыклад, датычыць машын для лёну, якія цяпер знаходзяцца на патоку эксперыментальнага завода цэнтра.)

І яшчэ назаву такія лічбы: калі ў 2002 годзе па распрацоўках цэнтра ў рэспубліцы выпускалася сельскагаспадарчай тэхнікі на 18 мільярдаў рублёў, то летась выпушчана на 287 мільярдаў. Дарэчы, гэта сведчыць не толькі пра непасрэдна нашу працу, а ў цэлым пра агульную запатрабаванасць сельскагаспадарчай вытворчасці ў новай сучаснай тэхніцы, пра тое, як адгукнулася на гэтую запатрабаванасць наша прамысловасць. Ну і, вядома ж, гэта сведчыць і пра адпаведны клопат дзяржавы, або канкрэтны клопат пра тое, каб гэтую тэхніку наша прамысловасць магла выпусціць, а сельская гаспадарка — купіць. Дзяржава дакладна вызначыла тыя фінансавыя механізмы, якія дазваляюць зрабіць гэта. Неабходна сказаць тут і пра наступнае: айчынная тэхніка, насуперак асобным сцвярджэнням, — добра запатрабаваная. Ды іначай і не можа быць, бо гэта, падкрэслю, якасна новая тэхніка, энерга- і рэсурсазберагальная, высокапрадукцыйная, гэта таксама тэхніка з шырокімі тэхналагічнымі магчымасцямі. Напрыклад, нашы глебаапрацоўча-пасяўныя агрэгаты могуць выконваць адразу па 3-4 аперацыі за адзін праход па полі. Мы апошнім часам наладзілі выпуск зусім новай для нас тэхнікі, якая забяспечвае выкананне тэхналагічных аперацый у бульбаводстве і льнаводстве.

— Тым не менш, напэўна, варта прызнаць, працаўнікі сельскай гаспадаркі часам аддаюць перавагу замежнай тэхніцы. Што вы на гэта скажаце?

— А мы давайце вызначым гэтую «перавагу» ў канкрэтных лічбах. Напрыклад, замежных трактароў на нашых палях працуе толькі каля 2 працэнтаў, замежнай прычапной тэхнікі — 5—10 працэнтаў, не болей. Разам з тым, сапраўды, у нашай сельскай гаспадарцы нямала працуе тэхнікі, якая выпушчана нашым машынабудаўнічым комплексам сумесна з замежнымі фірмамі. Скажам, выпускаецца ў нас у краіне сумесная сеялка разам з вядомай фірмай «Амазон». Гэта, аднак, нармальная сітуацыя, нармальная практыка. І тым больш гэта нармальна, калі мець на ўвазе, што недзе працэнтаў на 60 гэта сеялка скамплектаваная з нашых, айчынных, вузлоў і вырабаў і на 20—40 працэнтаў — з замежных. А вось гэты прыклад датычыць ужо непасрэдна нашага цэнтра, ці, дакладней, яго эксперыментальнай вытворчасці. У прыватнасці, мы сумесна з французскай фірмай «Дэхонт» не так даўно арганізавалі выпуск тэхнікі для ўборкі лёну. І ўжо вельмі хутка дасягнулі, так бы мовіць, нашага, айчыннага, зместу ў гэтай тэхніцы, лакалізацыі работ непасрэдна ў нас недзе на 40—50 працэнтаў.

Што датычыць чыста імпартнай тэхнікі, якая купляецца за мяжой, яна таксама выконвае не толькі чыста практычныя функцыі, г. зн. працуе непасрэдна на полі, — яе ўзоры (а купляецца, як правіла, сучасная імпартная тэхніка) служаць для нас у якасці пэўных параўнанняў, мы як бы звяраем з ёй свае распрацоўкі.

— Якія кірункі па стварэнні тэхнікі цяпер у цэнтра найбольш актуальныя?

— Адказваючы на гэтае пытанне, варта спачатку абазначыць адпаведны дзяржаўны клопат, назваць найбольш актуальныя на сёння дзяржаўныя праграмы. А гэта праграмы «Лён» і «Бульба». У поўнай адпаведнасці з гэтымі праграмамі дзейнічае і наш цэнтр. У прыватнасці, мы ўжо нямала папрацавалі па праграме «Лён», а цяпер пераважна працуем на праграму «Бульба». Мяркую, што зробім для выканання гэтых праграм высокаэфектыўныя сістэмы машын, якія забяспечаць комплексны падыход у гэтых галінах — ад пасеваў да захоўвання прадукцыі, нават яе перадпродажавай падрыхтоўкі. І такія машыны ўжо выпускаюцца непасрэдна ў цэхах нашай эксперыментальнай вытворчасці.

— Уладзімір Георгіевіч, вашы распрацоўкі абавязковыя для вытворцаў тэхнікі, ці яны носяць толькі рэкамендацыйны характар? Урэшце, менавіта ж ім, вытворцам, прадаваць потым адпаведную тэхніку, словам, адказваць за яе ўжо сваім рублём. Ды яны і самі ж могуць нешта стварыць, самастойна...

— Яны не могуць выканаць пэўную распрацоўку на тым узроўні, на якім зробім гэта мы. У нас, па-першае, ужо ёсць дакладная сістэма (комплекс) пэўных машын пад тую ці іншую культуру, ёсць дэталёвы аналіз таго, што сельскай гаспадарцы на дадзены момант патрэбна, нарэшце, нагадаю, мы працуем згодна з заказамі Міністэрства сельскай гаспадаркі. Так, вытворцы могуць зрабіць і самі, але каму потым прададуць? Увогуле, у гэтым плане задзейнічана вельмі сур'ёзная сістэма. Напрыклад, цяпер вельмі сур'ёзнымі з'яўляюцца пытанні стварэння комплексаў машын для жывёлагадоўлі. І гэта павінны быць менавіта комплексы машын, механізмаў, рознага дапаможнага абсталявання, а не разрозненыя, зусім не звязаныя паміж сабой тэхналагічна асобныя адзінкі і экзэмпляры, няхай і вельмі добрыя. Гэтае пытанне — комплекснай механізацыі той ці іншай формы — павінна вырашацца з усебаковым папярэднім аналізам. Ці можна на ўзроўні асобна ўзятага прадпрыемства забяспечыць такі вось дакладны аналіз і комплексны падыход да вырашэння пытанняў па механізацыі ўсіх вытворчых працэсаў?..

— Такое пытанне: у Мінску нядаўна была праведзена чарговая міжнародная выстаўка «Белагра», якая, увогуле, атрымалася даволі маштабнай. Пры гэтым, што датычыць узораў сельскагаспадарчай тэхнікі, якая дэманстравалася на выстаўцы, айчынная яўна пераважала. І гэта вельмі няблага. Але вось закавыка: ва ўсіх прадстаўленых узорах можна было проста заблудзіць, часам падавалася, што гэтыя ўзоры проста паўтаралі адзін аднаго. Як арыентавацца ва ўсім гэтым сельскагаспадарчаму працаўніку?

— Найперш адзначу ўдзел у гэтай, сапраўды маштабнай, выстаўцы непасрэдна нашага цэнтра. А мы выставілі сёлета каля 60 узораў тэхнікі, вырабленай непасрэдна ў нашай эксперыментальнай вытворчасці — болей, чым калі-небудзь. Акрамя таго, каля 20 узораў тэхнікі, створанай па распрацоўках цэнтра, выставілі іншыя прадпрыемствы.

А цяпер адкажу на зададзенае пытанне, прычым спачатку больш дакладна сфармулюю яго. А яно, няйначай, наступнае: ці каардынуе хто ў краіне ўвесь гэты працэс па выпуску сельскагаспадарчай тэхнікі? Адкажу на гэта так: на пэўным этапе гэтага не было, і напэўна, было і няблага, што яе выпускам займаліся многія. Гэта значыць, што гаспадаркі пры набыцці тэхнікі маглі, маючы на ўвазе аналагічныя вырабы некалькіх вытворцаў, выбраць лепшае па якасці, па цане. Словам, падобная раскіданасць пэўных вырабаў па многіх вытворцах сапраўды прысутнічала. Цяпер жа ўхіл робіцца на большую канцэнтрацыю гэтага працэсу — з тым, каб пазбавіцца ад выпадковых вытворцаў, гэты працэс каардынуецца. Як усё гэта выглядае? Выпускаюць сельскагаспадарчую тэхніку пераважна прадпрыемствы Міністэрства прамысловасці, яны і атрымліваюць у нас усю дакументацыю, якая распрацоўваецца ўжо ў адпаведнасці з заказамі Міністэрства сельскай гаспадаркі. Словам, наш цэнтр (ад імя Акадэміі навук, у распраджэнні якой ён знаходзіцца), разам з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і Міністэрствам прамысловасці і ажыццяўляюць у гэтым кірунку пэўную тэхнічную палітыку; пры гэтым створаны і адпаведны каардынацыйны савет. Да таго ж, варта нагадаць, у краіне задзейнічаны дзве дзяржаўныя праграмы — «Белагракомплекс» (па распрацоўцы тэхнікі для механізацыі вытворчых працэсаў у жывёлагадоўлі) і «Белсельгасмеханізацыя» (распрацоўка прычапной тэхнікі для вёскі). Гэтыя праграмы, у прыватнасці, і закліканыя ўпарадкаваць усю адпаведную работу, закліканыя праводзіць яе сістэмна. Акрамя таго, мы таксама стварылі каардынацыйны савет і з «Белаграмашам» — найбуйнейшым у краіне канцэрнам па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі. Гэты савет рэгулярна, раз у квартал, абмяркоўвае пэўныя пытанні — напрыклад, наконт таго, на якіх прадпрыемствах распачаць вытворчасць той ці іншай тэхнікі, на якіх, у сувязі з яе нізкай якасцю, — закрыць. Такім чынам, па сутнасці, менавіта за гэтым саветам вырашальнае слова наконт таго, што і дзе выпускаць; па сутнасці, менавіта ён і каардынуе ўвесь працэс.

І яшчэ ў сувязі з гэтым такая, даволі паказальная, з дазволу, дэталь. Ужо вядома, цяпер многія ўкаранілі ў сябе сістэмы менеджменту якасці (у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі ІСО), але яшчэ далёка не ўсе. І мы ўжо прыйшлі да думкі, што на тыя прадпрыемствы, якія не маюць у сябе адпаведнага сертыфікату, не варта перадаваць нашу канструктарскую дакументацыю па выпуску тых або іншых машын; у такіх выпадках можна лічыць, што такія прадпрыемствы да гэтага тэхнічна негатовыя.

— Уладзімір Георгіевіч, вы ў гэтым выпадку ўскосна закранаеце пытанні якасці, тэхнічнай дасканаласці айчыннай сельскагаспадарчай тэхнікі. І яе ўзровень, прынамсі ўзровень той тэхнікі, якую давялося ўбачыць на вашым эксперыментальным канвееры, сапраўды высокі, гэта тэхніка цалкам параўнальная з найлепшымі замежнымі ўзорамі. Але найбольш строгім экзаменатарам гэтага ўзроўню служыць экспарт...

— Пытанне зразумелае. І павінен у сувязі з ім адзначыць: у нас ужо намеціўся паток пэўнай тэхнікі, якая ідзе ў Расію, а таксама ў іншыя постсавецкія рэспублікі. Так, паспяхова пастаўляе свае машыны за мяжу ААТ «Бабруйскагрtoмаш», а Мінойтаўскі рамонтны завод Лідскага раёна — свае сучасныя шматкорпусныя плугі. Вось і наша эксперыментальная вытворчасць пачынае працаваць на экспарт. Гэта, у прыватнасці, датычыць не так даўно створанай у нас тэхнікі для вырошчвання бульбы — ёю зацікавіліся ў Расіі, у Чувашыі.

Увогуле, мы апошнім часам вельмі сур'ёзна працуем з замежжам, нас нямала дзе добра ведаюць. Так, мы актыўна супрацоўнічаем, вядома ж, з Расіяй (і нават ствараем у ёй сумесныя вытворчасці), з Ізраілем (супрацоўнічаем у галіне аснашчэння малочнатаварных фермаў), з Венесуэлай, Іспаніяй, Германіяй, Францыяй (я ўжо казаў пра кааператыўныя сувязі з французскай фірмай «Дэхонт»), з Польшчай (у нас самыя цесныя сувязі з яе двума аналагічнымі даследчымі інстытутамі). Гэтае супрацоўніцтва, якое атрымала асабліва добрае развіццё апошнім часам, ідзе на добрую карысць як нам, так і нашым партнёрам.

— Сёння вельмі актуальныя пытанні энергазберажэння, у цэлым рэсурсазберажэння — якім чынам у цэнтры ўлічваюцца гэтыя пытанні падчас яго навуковых даследаванняў і канструктарскіх распрацовак, на што перш за ўсё звяртаецца ўвага, якім кірункам аддаюцца перавагі?

— Сёння гэтыя пытанні — энергазберажэння і ў цэлым рэсурсазберажэння трэба ставіць нават шырэй. Трэба не проста ўкараняць у сельскагаспадарчую вытворчасць энергазберагальную і рэсурсазберагальную тэхніку, а ў цэлым энерга- і рэсурсазберагальныя тэхналагічныя працэсы, класці ў аснову гэтых працэсаў не адзінкавыя, няхай і вельмі эфектыўныя віды тэхнікі, разлічанай на асобна ўзятыя аперацыі, а цэлыя, і я гэта ўжо адзначаў, комплексы машын, якія звязвалі б усе аперацыі тэхналагічнага ланцужка, асобныя тэхналагічныя працэсы ў адно цэлае. Гэта патрабаванне часу. Напрыклад, мы бачым, што затраты працы, энергіі ў нашай жывёлагадоўлі ў 2 разы вышэйшыя, чым у краінах ЕС. Так, на атрыманне аднаго цэнтнера малака ў нас затрачваецца 8—14 чалавека-гадзін, або ў 2—3 разы больш, чым у Еўропе, кармоў выдаткоўваецца ў 1,5 раза болей. Што трэба зрабіць, каб знізіць сабекошт нашага малака? А менавіта эфектыўнасць і сабекошт прадукцыі, падкрэслю, павінны выступаць у якасці асноўных крытэрыяў ва ўсім гэтым працэсе механізацыі, найвышэйшая эфектыўнасць пры найменшых затратах — такой павінна быць наша агульная ўстаноўка... Патрэбен менавіта комплекс мерапрыемстваў, і менавіта па ўсім тэхналагічным ланцужку — гэта значыць трэба ствараць і сучасныя, больш камфортныя ўмовы ўтрымання жывёлы, і сучасныя прагрэсіўныя метады даення (гэта, у сваю чаргу, патрабуе абсталявання спецыяльных даільных залаў), трэба дабівацца паляпшэння якасці кармоў (а гэта значыць, і якасці іх нарыхтоўкі, прыгатавання і захоўвання), для чаго таксама патрабуюцца адпаведныя тэхналогіі і адпаведная тэхніка. Словам, патрэбны сучасныя тэхналогіі, а пад іх адпаведныя машыны, механізмы, абсталяванне.

Далей, возьмем раслінаводства. Сёння ў ім актуальнае прымяненне тэхналогій, якія маюць на ўвазе максімальна магчымае скарачэнне праходжання па полі тэхнікі з яе агрэгатамі. Значыць, гэтыя агрэгаты павінны быць універсальныя, камбінаваныя, у іх павінна быць сумешчана па некалькі аперацый, якія неабходна выканаць. І ўзоры такіх агрэгатаў ужо створаныя. Напрыклад, пры пасадцы бульбы яны адначасова наразаюць грэбні, высаджваюць у гэтыя грэбні клубні і ўносяць стартавую дозу ўгнаенняў. Такіх бульбасаджалак, паводле распрацовак цэнтра, выпушчана ўжо ў краіне, у тым ліку і на нашым эксперыментальным заводзе, больш за 200.

Калі заглянуць крыху наперад, у асноўныя напрамкі развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці на 2011—2015 гады, мы павінны скараціць расход паліва на адзінку прадукцыі — на 15 працэнтаў, у цэлым працоўныя затраты на 40—60 працэнтаў, сабекошт той жа механізацыі работ — на 30 працэнтаў. Гэта вельмі сур'ёзныя задачы. Што для гэтага трэба? Трэба сур'ёзна папрацаваць над абнаўленнем нашага трактарнага парку (па падліках, абнавіць яго на 29 працэнтаў), камбайнавага (на 40 працэнтаў); трэба не менш як на 21 працэнт абнавіць нашу пасяўную і глебаапрацоўчую тэхніку. Нам вельмі неабходныя энерганасычаныя трактары, а пры гэтым важна мець і поўны набор адпаведных прычапных механізмаў да іх, і гэта ўжо, па сутнасці, перспектыўная задача для нашага цэнтра. Варта памятаць: выкарыстанне падобнай энерганасычанай тэхнікі вядзе да рэзкага росту прадукцыйнасці працы, значнага павышэння эфектыўнасці яе, а ў выніку і да вельмі значнага зніжэння сабекошту работ, а значыць — і да зніжэння сабекошту прадукцыі. Увогуле, мы ў гэтым плане павінны наблізіцца да еўрапейскіх стандартаў. І мы ўжо набліжаемся да іх. Так, калі раней у краіне здымалі збожжавых у сярэднім па 29—30 цэнтнераў з гектара, то сёння ўжо здымаем па 40, а ў асобных раёнах, напрыклад, у Гродзенскім, — і па 70. Тым не менш, працаваць ёсць над чым. Прычым варта памятаць, маючы на ўвазе нашу цвёрдую зарыентаванасць на ўзровень ЕС: гэта фактар не толькі механізацыі, але і генетыкі жывёлы, дакладнай селекцыйнай працы, захоўвання адпаведных агратэхнічных прыёмаў і правілаў і г.д. Сельскагаспадарчая вытворчасць патрабуе ў цэлым строгага навуковага падыходу. Для вучоных тут вялікі фронт працы. Без навукі, без навуковых задзелаў, без рэкамендацый вучоных сёння, калі мець на ўвазе пастаўленыя мэты, проста не абысціся. Кожны дадатковы кілаграм збожжа і кілаграм «лішняга» малака будзе браць усё цяжэй і цяжэй. Тут ужо мерапрыемствы чыста арганізацыйнага характару не дапамогуць. Толькі навука.

— Уладзімір Георгіевіч, вось вы гаворыце пра рэкамендацыі вучоных, а ці ва ўсякай гаспадарцы пачуюць гэтыя рэкамендацыі, прыслухаюцца да іх?

— Што ж, тут, як кажуць, ёсць пытанне. Увогуле хачу адзначыць: калі ў гаспадарцы здымаюць добры ўраджай, значыць у ёй працуюць добры аграном і нядрэнны галоўны інжынер. Аднак як дайсці менавіта да ўсіх? У нашым цэнтры гэтае пытанне таксама не застаецца па-за ўвагай. Па-першае, мы з'яўляемся філіялам інстытута БДАТУ па павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў. У нас пастаянна праходзяць навучанне і перападрыхтоўку спецыялісты сельскай гаспадаркі, прычым у нас рэалізуецца так званы праект «Аграваршыня» — на нашай эксперыментальнай базе «Зазер'е», дзе многія ідэі нашых навукоўцаў праходзяць, так бы мовіць, практычную апрабацыю. Безумоўна, возім мы туды і сваіх гасцей. Словам, мы не забываемся і пра пэўную асветніцкую работу, і гэта, думаю, прыносіць у цэлым неблагі вынік. А ўвогуле, калі вярнуцца да пытання наконт таго, ці ўсе пачуюць рэкамендацыі вучоных, напэўна, можна адказаць так: хто захоча, той пачуе, той сам знойдзе гэтыя рэкамендацыі. Яшчэ раз падкрэслю: сёння больш дакладнага, навукова абгрунтаванага вядзення сельскагаспадарчай справы, сельскагаспадарчай вытворчасці патрабуе сам час.

Іван БАРАНОЎСКІ.

УНП 100230575.

P.S. Ад імя калектыву рэдакцыі газеты «Звязда» шчыра віншуем Уладзіміра Георгіевіча Самасюка з юбілеем. Зычым яму моцнага здароўя і новых творчых поспехаў.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра Уладзімір САМАСЮК.

2. Падчас семінару ў эксперыментальнай гаспадарцы НПЦ «Зазер'е».

3. Сельскагаспадарчыя машыны і механізмы, распрацаваныя ў Навукова-практычным цэнтры.

Фота Аляксандра КРЭНЦЯ і з архіву НПЦ.

ТЭХНІЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ І ЯКАСЦЬ ВЫРАБАЎ НПЦ: СВЕДЧАЦЬ ФАКТЫ

2008 год, Масква, міжнародная выстаўка «Залатая восень» — самаходная машына па хімізацыі МХС-10, распрацаваная цэнтрам, адзначана залатым медалём. Дарэчы, гэта машына ўжо паспяхова працуе на сельскагаспадарчых палетках краіны.

2008 год, Масква, тая ж выстаўка «Залатая восень» — саджалка бульбяная паўнавясная СК-4 (распрацоўка цэнтра) таксама атрымлівае залаты медаль. Прычым гэтая саджалка пастаўлена ў адзін шэраг з найлепшымі замежнымі ўзорамі.

Масква, «Залатая восень-2009» — самаходны прэс-падборшчык ільну і самаходны паварочвальнік ільну, перад гэтым толькі што распрацаваныя цэнтрам і сабраныя на яго эксперыментальным заводзе, атрымліваюць адпаведна залаты і сярэбраны медалі выстаўкі.